КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 19 (195)
◂ 21 МАЯ ◂ 2010 г.
www.novychas.org

# Новы Час



ЭПОХА БАРАДУЛІНА

Стар. 15

**НЕБА ЎПАЛА НА ЗЯМЛЮ**

У прадпрымальніцкіх колах праект Дырэктывы №4 называюць «пераваротным дакументам»

Стар. 5

**КАДАФІ РАЗГАВАРЫЎСЯ**

Муамар Кадафі на мінулым тыдні падзяліўся з журналістам нямецкага часопіса «Spiegel» сваімі думкамі

Стар. 13

**ЦІ ЁСЦЬ ГНОМЫ Ў ІРАНЕ?**

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**АДРАДЖЭННЕ СЯДЗІБАЎ**

Нарыс Аляксея Хадыкі з цыклу «Спадчына»

ПАГРОМ




Photo.ByMedia.Net

# ПРАЎДУ АДПРАВІЛІ НА АКРЭСЦІНА

Генадзь КЕСНЕР

**Адразу ў розных рэгіёнах Беларусі 18 і 19 мая адбыліся затрыманні актывістаў грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду», а таксама вобшукі ў офісах гэтай кампаніі і ў кватэрах яе ўдзельнікаў. Лідэр кампаніі паэт Уладзімір Някляеў, а таксама галоўны рэдактар недзяржаўнай газеты «Товарищ» Сяргей Вазняк і актывіст Аб'яднанай грамадзянскай партыі Андрэй Дзмітрыеў былі змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання.**

## Як гэта адбывалася

Першыя звесткі пра ператрусы з'явіліся прыкладна а 13-й гадзіне ў мінулы аўторак — у галаўным офісе кампаніі «Гавары праўду» на праспекце Машэрава ў Мінску з'явіліся асобы ў цывільным, якія затрымалі практычна ўсіх, хто там знаходзіўся, забаранілі актывістам пакідаць памяшканне і праз некаторы час адвезлі людзей у Ленінскі РУУС сталіцы.

Некалькі гадзін ніхто не разумеў, на якіх падставах прадстаўнікі спецслужб затрымлівалі людзей, а таксама праводзілі ператрусы як у офісах, так і ў кватэрах грамадскіх актывістаў (да гэтага часу ўжо стала вядома, што аналагічныя мінскім падзеі адбываліся і шмат у якіх іншых гарадах Беларусі — Гомелі, Брэсце, Гродна, Магілёве, Бабруйску, Барысаве, Ваўкавыску, Салігорску, Бялынічах і гэтак далей) і адымалі кампутары, аргтэхніку, сродкі сувязі, носьбіты інфармацыі, дакументацыю і нават грошы.

18 мая пад шматгадзінную працэдуру вобшукаў з «канфіскацыяй» і допытаў падпалі вядомы журналіст Аляксандр Фядута і галоўны рэдактар газеты «*Товарищ*», сябра Рады ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» Сяргей Вазняк, кіраўнік Аксіяметрычнай лабараторыі «НовАК» прафесар Андрэй Вардамацкі, сябра БАЖ Аляксандр Уліцёнак, каардынатар кампаніі «Гавары праўду» па Фрунзенскім раёне Мінску Юрась Фабішэўскі, актывісты АГП Аляксандра Васілевіч, Віталь Гуляка і Зміцер Бандарчук, іншыя людзі, якія хоць неяк спрычыніліся да гэтай кампаніі.

## Што інкрымінуюць

Варта адзначыць, што толькі ў Ленінскім РУУС людзям паведамілі, што яны праходзяць сведкамі па крымінальнай справе, распачатай паводле часткі 1 артыкула 250 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (распаўсюджванне ілжывай інфармацыі пра тавары і паслугі).

Вобшук і апісанне маёмасці ў галаўным офісе кампаніі «Гавары праўду» працягваўся да самага вечара. Практычна ўвесь дзень ні журналісты, ні грамадскія актывісты нічога не маглі даведацца пра месцазнаходжанне лідэра кампаніі Уладзіміра Някляева. Пазней высветлілася, што ў яго дома таксама адбыўся ператрус, самога ж паэта прывезлі ў Ленінскі РУУС толькі позна ўвечары, дзе і пакінулі на ўсю ноч. Допыт Някляева пачаўся толькі аб 11-й гадзіне наступнага дня.

Сяргей Вазняк і Андрэй Дзмітрыеў, якіх, як пазней і Някляева, абвесцілі падазраванымі па згаданай вышэй крымінальнай справе, яшчэ ўвечары былі дастаўлены ў ізалятар часовага ўтрымання ў сталічным завулку Акрэсціна.

У Гомелі апоўдні ў аўторак міліцыянты і людзі ў цывільным прыйшлі да былога дэпутата Вярхоўнага Савета СССР Юрыя Варонежцава. Пэўны час Варонежцаў не адчыняў, але з дапамогай спецназу спецслужбоўцы ўсё ж трапілі ў кватэру вядомага грамадскага дзеяча, які ў тэлефоннай гутарцы з калегамі выказаў меркаванне, што ўварванне ў кватэру звязана з яго ўдзелам у кампаніі «Гавары праўду».

Падчас пяцігадзіннага вобшуку ў Варонежцава міліцыянты забралі тры ноўтбукі, адзін з якіх належыць дзесяцігадовай дачцэ, кампутар яго сына, відэакамеру, мабільныя тэлефоны, дыскі, касеты, флэшкі, кнігі і грошы ў памеры ад 5 да 7 тысяч долараў. «Большая частка грошай належала жонцы. Нават не ведаем, на што жыць», — адзначыў Юры Варонежцаў у інтэрв'ю БелаПАН.

Ператрус ладзілі супрацоўнікі УУС Гомельскага аблвыканкаму «паводле пастановы аб правядзенні вобшуку ў межах крымінальнай справы». Пастанову падпісаў старшы следчы следчага аддзелу Ленінскага РУУС Мінску спадар Юхневіч і пракурор Ленінскага раёна сталіцы спадар Украінец. Дарэчы, абуральныя моманты падчас правядзення ператрусаў былі яшчэ ў іншых месцах, да іх мы яшчэ вернемся.

## Прэс-канферэнцыя

На наступны дзень актывісты кампаніі «Гавары праўду», якія прайшлі праз ператрусы, канфіскацыі і допыты, правялі тэрміновую прэс-канферэнцыю ў сядзібе Партыі БНФ, дзе ледзь хапіла месцаў усім жадаючым паслухаць расповеды непасрэдных удзельнікаў падзей.

«Працуючы ад самага пачатку стварэння незалежнага друку ў Беларусі, я як журналіст упершыню за ўсе гэтыя гады стаў сведкам такой маштабнай, аднамомантавай і ўразлівай акцыі па скасаванні працы арганізацый, якая, па сутнасці, дзейнічае ўсяго адзін квартал», — сказаў Аляксандр Уліцёнак.

«Учора адбылася паказальная акцыя, якую можна назваць «пагром грамадзянскіх актывістаў», — заявіў Аляксандр Фядута. — Чаму было зроблена менавіта так, менавіта паказальна, адначасова? Нават следчыя, якія прыязджалі ў кватэры нашых актывістаў, не разумелі, што шукаць, апроч носьбітаў інфармацыі, не маглі адказаць ні на якія пытанні. На мой погляд, гэта звязана з тым, чым займаліся і займаюцца актывісты грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду». Яны не займаліся палітыкай у тым сэнсе, у якім мы прызвычаіліся ўспрымаць гэтае слова. Яны займаліся выказваннем сваёй грамадзянскай пазіцыі ў адносінах да шэрагу пытанняў, наконт якіх кожны грамадзянін Беларусі мае законнае права выказацца.

Працяг на стар. 4 ▸

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### АШМЯНЫ. УПЕРШЫНЮ Ў РЭГІЁНЕ

Ашмяншчына рыхтуецца да выставы-кірмашу і інвестыцыйна-эканамічнага форуму «Паўночны вектар Гродзеншчыны», які адбудзецца 9–10 ліпеня 2010 года. Удзел у выставе прымуць больш за 70 прадпрыемстваў розных формаў уласнасці з Ашмянскага, Астравецкага і Смаргонскага раёнаў. Праграма выставы-кірмашу прадугледжвае некалькі вялікіх і значных мерапрыемстваў: інвестыцыйна-эканамічны форум, прэзентацыя банкаўскіх паслуг і інш.

### ЛІДА. «ДАЖЫНКІ» ЗНІШЧАЮЦЬ МІНУЛАЕ

Праца па падрыхтоўцы да Дажынак у Лідзе вядзецца штодзённа і з размахам. На мінулым тыдні распачаліся работы па зносу асобных старых прыватных дамоў. Гістарычную вартасць іх ніхто не даследаваў. Неўзабаве ля рэчкі паўстане амфітэатр, дзе пройдуць асноўныя мерапрыемствы дзяржаўнага свята. Гарадскія ўлады абяцаюць, што жыхары знесеных дамоў у перспектыве атрымаюць дабраўпарадкаванае жыллё ў шматкватэрных дамах, але тэрміну не называюць. Пры гэтым сцвярджаюць, што на месцы знесеных пабудоў паўстане прыгожая панарама. Акрамя таго, у чарговы раз разбурылі Лідскі замак, помнік архітэктуры 1323 года. Зараз на месцы большай часткі сцен з каменю тырчыць арматура.

### БРЭСТ. ЗНАЁМЯЦЬ З ТВОРЦАМІ

Раённая бібліятэка распачала праводзіць шэраг сустрэч з мэтай знаёмства чытачоў з беларускамоўнымі аўтарамі. Адным з першых прыйшоў на сустрэчу мясцовы творца Алесь Паплаўскі. Ён аўтар двух паэтычных зборнікаў: «Спынены лістапад» (l997) і «Незваротнасць» (2001) — а таксама кніжкі прозы «Тэрыторыя скразнякоў» (2004). Паэтычныя і празаічныя творы змяшчалі часопісы: «Першацвет», «Маладосць», «Тэрмапілы». Арганізатары імпрэзы лічаць, што мерапрыемства атрымалася і маюць намер надалей працягваць сустрэчы.

### НЯСВІЖ. ГІСТОРЫЮ ШАНУЮЦЬ ЗАМЕЖНІКІ

Дэлегацыя латвійскіх парламентарыяў на чале са старшынёй камісіі па міжнародным справам Сейма Андрысам Берзіньшам падчас афіцыйнага візіту ў РБ пабывала ў Нясвіжы. Як выказаўся адзін з удзельнікаў дэлегацыі, наведванне Радзівілаўскага асяродка было непахісным жаданнем дэлегацыі спрычыніцца да гісторыі нашай дзяржавы.

### ПАСТАВЫ. БЕЛАРУСАМ ЗНІЖКА

Як і ў мінулым годзе, сайт www.westki.info аказвае інфармацыйную падтрымку фестывалю балцкага фолку і цяжкога металу Kilkim Zaibu. Сёлета ён адбудзецца на беразе возера Лукстас, што ля Варняй у Жэмайціі, з 11 па 12 чэрвеня. Поўны склад удзельнікаў вызначаны. У фэсце прымуць удзел музычныя калектывы з Літвы, Латвіі, Эстоніі, Украіны, Фінляндыі, нават з Аўстраліі. Хоць беларускіх выканаўцаў там пакуль няма, але для беларускіх аматараў гэтага музычнага жанру створана падтрымка. І таму зарукай вышэй згаданы сайт, дзе засведчана: «Па пытаннях даезду на фестываль з Беларусі звяртайцеся праз форму кантактаў нашага сайта. З Вільні будзе арганізаваны спецыяльны аўтобус (праезд абыдзецца на палову танней, чым калі ехаць грамадскім транспартам).

Падрабязней пра фестываль чытайце ў адмысловай рубрыцы нашага сайта, а таксама на афіцыйным сайце фестывалю».

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

ПЕРАТРУС

# ПРАЎДУ КАЗАЦЬ НЕБЯСПЕЧНА

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Падчас акцыі запалохвання, распачатай сілавым структурамі супраць актывістаў грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду», меў непрыемнасці і грамадскі распаўсюджвальнік «НЧ» Алег Мяцеліца з Бялынічаў.**

18 мая пасля 22 гадзін двое міліцыянтаў з Магілёва, адзін з якіх быў у званні маёра, пачалі вобыск у кватэры Алега.Ператрус адбываўся паводле пастановы Ленінскага аддзела міліцыі Мінска. Паколькі Мяцеліца паабяцаў, што будзе паводзіць сябе карэктна, то нарад АМАПа ў кватэру не заходзіў.

«Мне так падалося, што яны самі не ведалі, чаго шукаюць. Прапанаваў: давайце сам аддам, што вам патрэбна. Яны адразу сумеліся. Іх цікавілі кампутары. У мяне іх не было. Забралі некалькі нататнікаў «Гавары праўду», дзесятак візітовак Някляева, забралі дыск з фільмам «Беларусь пад нямецкай акупацыяй». Паводзілі яны сябе карэктна. На запыт: «Ці ададзіце забранае?» у недаўменні пераглянуліся і адказалі: «Перададзім усё ў Мінск. Там будуць вырашаць», — расказаў сам Алег Мяцеліца.

Аднак на 19 мая ранкам аўтамабіль Мяцеліцы затрымалі супрацоўнікі міліцыі і з нагоды, што быццам бы ў аўто знаходзіцца літаратура без выходных дадзеных, правялі вобыск. Зноў жа канфіскавалі друкаваную прадукцыю кампаніі «Гавары праўду», а з 17 паасобнікаў газеты «Новы час», што былі ў машыне, толькі адзін узялі на экспертызу.

БІЗНЕС

# ПЕРСПЕКТЫВУ ЎЛІЧАЦЬ

**Прапановы РГА «Перспектыва», што тычацца дробнарознічнага гандлю, будуць улічаны пры распрацоўцы праграм развіцця Мінска ў сферы гандлю, грамадскага харчавання, бытавых паслуг і турызму на 2011–2015 гады. Пра гэта гаворыцца ў адказе Мінгарвыканкама на зварот «Перспектывы».**

Арганізацыя прапаноўвала выдзеліць прадпрымальнікам пад гандлёвыя аб'екты пакрокавай даступнасці прыкладна 4 500 зямельных участкаў у Мінску. «Аднак у адказе дакладна гаворыцца, што прыярытэтам на бліжэйшы час у гандлёвай сферы Мінска будзе будаўніцтва гіпер- і супермаркетаў. Прадпрымальнікам прапануюць адкрываць міні-кафэ і гандляваць квасам», — зазначыў старшыня арганізацыі Анатоль Шумчанка.

Мінгарвыканкам паведаміў прадпрымальнікам, што «прадугледжваецца штогадовае адкрыццё новых аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання, бытавога абслугоўвання, аптымальнае размяшчэнне, а таксама пашырэнне за кошт перапрафілявання, рэканструкцыі і абнаўлення матэрыяльнай базы дзейных прадпрыемстваў». У 2010 годзе ў Мінску прадугледжана ўвесці ў эксплуатацыю 189 аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання і не менш як 300 аб'ектаў бытавога абслугоўвання.

Паводле інфармацыі гарвыканкама, «у мэтах актывізацыі маёмаснай падтрымкі суб'ектаў малога прадпрымальніцтва Мінгарвыканкамам і Адміністрацыяй прэзідэнта ўнесена прапанова па правядзенні інвентарызацыі офісных памяшканняў, вытворчых аб'ектаў і аб'ектаў гандлю, якія не выкарыстоўваюцца. Гэтыя аб'екты прапануўваецца выставіць на продаж праз тэндэр. Пры гэтым плануецца прадугледзець магчымасць іх продажу ў растэрміноўку з тэрмінам пагашэння на працягу трох гадоў».

«Мы ўсё ж такі спадзяемся, што патэнцыял мінскіх прадпрымальнікаў, які быў бяздарна растрачаны пасля зносу кіёскаў, усё ж будзе прыменены ў нашай сталіцы і не толькі ў гандлі квасам, а ва ўдзеле малога бізнесу ў сур'ёзных праектах», — гаворыць Шумчанка.

Тое, што зараз адбываецца ў Мінску, зазначыў Шумчанка, адбывалася і ў еўрапейскіх сталіцах, калі буйныя магазіны выцеснілі малы бізнес. «Сёння адбываецца звароты працэс, калі дзяржава бярэ ўдзел у працэсе развіцця дробнай розніцы і гарантуе ўдзел прадпрымальнікаў у развіцці гарадоў. Да гэтага наша сталіца прыйдзе, і кіёскі вернуцца»,— маркуе старшыня арганізацыі.

**БелаПАН**

ЗАЯВА

# АГП І МІЛІНКЕВІЧ СУПРАЦЬ

**Палітсавет Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) 18 мая прыняў заяву, у якой выказвае пратэст у сувязі з затрыманнямі сваіх актывістаў і вобыскаў на іх кватэрах.**

У заяве адзначаецца, што 18 мая супрацоўнікі сілавых структур затрымалі і правялі вобыскі на кватэрах актывістаў АГП Юрыя Фабішэўскага, Аляксандры Васілевіч, Дзмітрыя Бандарчука, Віталя Гуляка.

Палітсавет АГП патрабуе ад прадстаўнікоў сілавых структур тлумачэнняў, а таксама звяртаецца да міжнароднай грамадскасці з заклікам выказаць салідарнасць з усімі затрыманымі 18 мая.

Палітсавет АГП лічыць, што затрыманні звязаныя з прэзідэнцкай кампаніяй. У заяве адзначаецца, што «ўлада можа кантраляваць сітуацыю толькі брутальнымі сілавымі метадамі. Тое, што адбываецца, сведчыць, што Лукашэнка не ўпэўнены ні ў сабе, ні ў тым, што ён можа кантраляваць сітуацыю напярэдадні прэзідэнцкай кампаніі».

Таксам асудзіў «чарговую хвалю рэпрэсій, затрыманні і ператрусы на кватэрах грамадскіх актывістаў і журналістаў» і лідэр руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч.

«Такія дзеянні ўладаў неадэкватныя і абуральныя. Яны паказваюць слабасць рэжыму», — цытуе Мілінкевіча яго прэсслужба.

Палітык заклікаў беларускую грамадзянскую супольнасць да «кансалідацыі і салідарнасці».

**Паводле інфармацыі АГП і руху «За свабоду»**

ПРАЕКТ

# ХТО АДРОДЗІЦЬ ВІЦЕБСК?

**Амерыканскі бізнесмен выказаў жаданне фінансаваць праект па адраджэнні гістарычнай часткі Віцебска. Пра гэта паведаміў 18 мая ў Мінску на прэс-канферэнцыі старшыня Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадскіх аб'яднанняў і абшчын, заслужаны архітэктар Беларусі, лаўрэат Ленінскай прэміі, кіраўнік архітэктурнай творчай майстэрні Леанід Левін.**

Падчас нядаўняй паездкі ў ЗША ён пазнаёміўся з буйным амерыканскім прадпрымальнікам грэчаскага паходжання, які зацікавіўся праектам «Залатая спадчына Віцебска». Паводле слоў Левіна, найбліжэйшым часам амерыканскі прадпрымальнік прыбудзе ў Беларусь для больш дэталёвага азнаямлення з праектам і яго ініцыятарамі.

Старшыня саюза таксама паведаміў, што на днях Міністэрства юстыцыі зарэгістравала міжнародны фонд «Залатая спадчына Віцебска», сярод заснавальнікаў якога сам архітэктар, старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і работадаўцаў Уладзімір Карагін і генеральны дырэктар СТАА «Марка» (Віцебск) Мікалай Мартынаў.

Левін лічыць, што фонд як грамадская арганізацыя зможа прыцягнуць сродкі, неабходныя для рэалізацыі праекта, распрацаванага дзвюма творчымі майстэрнямі, — яго і «Арх-сіці» (Віцебск).

Гаворка ідзе пра рэканструкцыю гарадскога квартала змешанай забудовы XVIII–XIX стагоддзяў плошчай каля 50 гектараў, размешчанага паміж чыгуначным вакзалам і ракой Заходняя Дзвіна. Уваходам у гэты квартал з'яўляецца Полацкая плошча з помнікам Марку Шагалу, а цэнтрам — вуліца Пакроўская, дзе нарадзіўся вялікі мастак.

Аўтары праекта маюць намер максімальна перадаць дух канца XIX — пачатку XX стагоддзяў і гістарычнае асяроддзе, дзе жыў і тварыў Шагал і іншыя вядомыя прадстаўнікі Віцебскай мастацкай школы. У рэканструяваным квартале будуць створаны музеі, навучальныя ўстановы мастацтваў, галерэі і выставачныя залы, у якіх еўрапейскія мастакі змогуць не толькі экспанаваць свае працы, але і праводзіць пленэры. Акрамя таго, праект уключае жылую, гандлёвую і гасцінічную зоны, а таксама аўтастаянкі, якія дазволяць забяспечыць увесь спектр турыстычных паслуг для гараджан і гасцей Віцебска.



**БелаПАН**

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ВАЙНА ПА ЎСІХ ФРАНТАХ

*Сяргей САЛАЎЁЎ*

**Нарэшце «беларуская стабільнасць», здаецца, дагарэзнічала. Такога ціску «сінявокая» з абодвух бакоў — Захаду і Усходу — пэўна, яшчэ не ведала. І гэты ціск надарыўся неяк сінхронна. Ці выпадкова гэта?**




Па-першае, Кіраўніцтва Савета Еўропы асудзіла вынясенне яшчэ двух смяротных прысудаў у Беларусі. 14 мая Гродзенскі абласны суд прыгаварыў да вышэйшай меры пакарання двух жыхароў Гродна. Яны прызнаныя вінаватымі ў забойстве з асаблівай жорсткасцю трох чалавек, разбоі з нанясеннем цяжкіх цялесных пашкоджанняў, наўмысным пашкоджанні маёмасці і выкраданні малалетняга. Прысуд яшчэ не ўвайшоў у законную сілу і можа быць абскарджаны ў Вярхоўным судзе на працягу 10 сутак.

«Гэтыя прыгаворы сведчаць пра неабходнасць тэрмінова абвясціць мараторый на смяротную кару, — заявіў генеральны сакратар Савета Еўропы Турб'ёрн Ягланд. — Прымяненне смяротнай кары па-ранейшаму з'яўляецца галоўнай перашкодай у адносінах Беларусі з Саветам Еўропы. Мы гатовы аказаць садзеянне ў вырашэнні гэтага пытання і дапамагчы Беларусі стаць бліжэй да стандартаў Савета Еўропы ў сферы правоў чалавека».

Адмяніць нядаўнія смяротныя прысуды афіцыйны Мінск таксама заклікалі старшыня Камітэта міністраў Савета Еўропы Антоніа Мілашоскі і кіраўнік Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Меўлют Чавушаглу.

«Мы заклікаем прэзідэнта Лукашэнку неадкладна адмяніць два смяротныя прысуды, неадкладна ўвесці мараторый на смяротную кару і замяніць усе смяротныя прысуды на іншыя віды пакарання, каб наблізіць Беларусь да стандартаў Савета Еўропы, — гаворыцца ў сумеснай заяве Мілашоскі і Чавушаглу. — Прымяненню смяротнай кары няма месца ў пенітэнцыярнай сістэме сучаснага грамадства. Гатоўнасць неадкладна аб'явіць мараторый на смяротную кару і яе далейшая адмена з'яўляюцца найважнейшай умовай для ўступлення ў СЕ».

Што гэта азначае для шараговых грамадзян Беларусі? Гэта азначае, што мы зрабілі два крокі назад ад спрашчэння візавага рэжыму з краінамі Еўрасаюза. То бок, візы па-ранейшаму застануцца занадта дарагімі для беларусаў, якія жадаюць выехаць у краіны ЕС. Да таго часу, пакуль краіна не наблізіцца да стандартаў ЕС.

Не лепшыя адносіны і з Расіяй. Беларускі бок на сустрэчы кіраўнікоў урадаў краін Мытнага саюза ў Санкт-Пецярбургу будзе настойваць на адмене мытных пошлін на нафту і нафтапрадукты ва ўмовах саюза. Пра гэта паведаміў Аляксандру Лукашэнку прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі падчас даклада 17 мая.

Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб тым, што 21 мая ў Санкт-Пецярбургу адбудзецца сустрэча прэм'ер-міністраў краін СНД у межах правядзення Савета кіраўнікоў урадаў СНД, а таксама двух пасяджэнняў Міждзяржсавета ЕўрАзЭС на ўзроўні кіраўнікоў урадаў — у фармаце пяці дзяржаў і ў фармаце вышэйшага органа Мытнага саюза.

Ёсць шэраг пытанняў, па якіх беларускі бок будзе адстойваць сваю прынцыповую пазіцыю. Гэта тычыцца найперш неўвядзення ў дзеянне або адмены абмежаванняў па свабодным перамяшчэнні тавараў у Мытным саюзе. Размова ідзе, да прыкладу, аб мытных пошлінах на нафту і нафтапрадукты.

Прэзідэнтам падчас сустрэчы дадзены даручэнні адносна ўмоў увозу фізічнымі асобамі легкавых аўтамабіляў у Беларусь у межах Мытнага саюза. Паводле інфармацыі прэс-службы кіраўніка дзяржавы, пазіцыя беларускага боку заключаецца ў тым, каб яго інтарэсы былі максімальна ўлічаны. Трэба захаваць мытныя пошліны або прыняць узважанае рашэнне і зрабіць іх такімі, якія б задавольвалі ўсе тры дзяржавы. Прынамсі казахстанскі бок у перамоўным працэсе падтрымлівае прапанову Беларусі, паведаміў Сідорскі.

А тым часам аўтааматары рыхтуюцца да страйку. Яны заклікаюць беларусаў праігнараваць 4 чэрвеня запраўкі. Аўтааматары абураны ўжо трэцім за год падвышэннем коштаў на бензін. Нагадаем, 12 мая цэны на паліва павысіліся ў сярэднім на 6%. Раней, 27 лютага яны былі падвышаныя ў сярэднім на 7%, 23 студзеня — на 2%.

Як вынік — сярод наведвальнікаў сайтаў «Аўтамалінаўка» і stop-gai.by выспела ідэя пратэстнай акцыі «Стоп бензін!». Неабыякавых аўтааматараў заклікаюць 1–4 чэрвеня (упор робіцца на 4 чэрвеня) абмежаваць сваё перамяшчэнне на аўто і праігнараваць запраўкі.

Як кажацца на сайтах аўтааматараў, абгрунтаваннем для чарговага павышэння коштаў паслужыла ўзняцце пошлін на нафту расійскім бокам. Але цана, па якой Беларусь набывае нафту для ўнутранага спажывання, не абкладаецца пошлінай. «Мы — не дойныя каровы. Чаму мы павінны пакутаваць і купляць бензін па тых коштах, якія не адпавядаюць нашаму ўзроўню даходаў?!» — задаюць пытанне аўтамабілісты

Кампанія «Стоп бензін!» ужо стала рэзананснай, яе падтрымалі прадстаўнікі некалькіх аўтаклубаў, ведаюць і сочаць за падрыхтоўкай акцыі і «на самым версе». Створаны сайт «Стоп бензін!», на днях будуць распаўсюджаны першыя майкі і налепкі з заклікам ігнараваць 4 чэрвеня аўтазапраўкі.

«Мы не патрабуем ад урада нізкіх коштаў на бензін. Мы хочам толькі, каб яго кошт залежаў ад ваганняў коштаў на сусветным рынку, а не ад жадання ўлады. Калі кошты на сусветным рынку панізіліся — паніжайце, калі падвысіліся — падвышайце, але яны не павінны ўстанаўлівацца ў прыказным парадку», — так раскрыў пасыл пратэстнай кампаніі адзін з яе ініцыятараў Уладзіслаў Бянько.

І за нас аўтааматары падлічылі, колькі недаатрымае дзяржава ад байкоту заправак на працягу 1–4 ліпеня. «5 дзён х 20 літраў х 2870 рублёў = 287000 рублёў х 2 = 574000 рублёў (паўмільёна або груба 190 баксаў) яны недаатрымаюць. А калі я не адзін такі буду? Што з гэтага атрымаем?» — задае пытанне на форуме адзін з аўтааматараў.

Я не ведаю, што «яны» недаатрымаюць, але я ведаю, што могуць атрымаць аўтамабілісты. За паўмільёна можна набыць някепскі ровар. А ровар — гэта шмат здароўя, шмат хто з аўтааматараў зможа палепшыць сваю фігуру, гэта стыльна, гэта прышпільна. Ровар несумяшчальны з паленнем і алкаголем. Гэта вам скажа любы супрацоўнік ДАІ — штодзень каля 30 кіроўцаў аўто трапляюць пад увагу ДАІ за кіраванне ў нецвярозым стане. Але пакуль што ніводнага раварыста не затрымалі за ваджэнне ровара «паддатым».

Можа, праспект Незалежнасці стане роварнай трасай?

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### СЯРГЕЙ КРЫВЕЦ



Беларускі футбаліст Сяргей Крывец стаў чэмпіёнам Польшчы ў складзе клуба «Лех». Познанскі «Лех» заваяваў залатыя медалі ўнутранага чэмпіяната ўпершыню з 1993 года. Да гэтага каманда станавілася чэмпіёнам Польшчы пяць разоў — у 1983, 1984, 1990, 1992 і 1993 гадах.

23-гадовы форвард беларускай футбольнай зборнай Сяргей Крывец перайшоў у «Лех» з барысаўскага клуба БАТЭ напрыканцы 2009 года. Тады клуб займаў трэцяе месца, адстаючы ад «Віслы» і ад варшаўскай «Легіі». У 30 матчах каманда з Познані набрала 65 балаў, апярэдзіўшы на тры бала кракаўскую «Віслу». У складзе польскай каманды Крывец правёў 12 матчаў, забіў тры мячы і атрымаў адно папярэджанне. Кантракт з «Лехам» падпісаны на тры з паловай гады.

Сяргей Крывец — выхаванец гродзенскай футбольнай школы, тройчы станавіўся чэмпіёнам Беларусі, двойчы яго ўключалі ў спіс 22-х лепшых футбалістаў чэмпіянату, уладальнік Кубка Беларусі. Спартсмен выступае за зборную Беларусі і нядаўна запэўніў журналістаў, што не збіраецца мяняць грамадзянства ды выступаць за іншую краіну: «Ад Беларусі я не адмоўлюся. Бо я люблю Беларусь. І буду гуляць толькі за зборную Беларусі».

### АЛЯКСАНДР ЗІМОЎСКІ



Кіраўнік Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Аляксандр Зімоўскі ў сваім блогу на рэсурсе naviny.by выказаўся наконт магчымых зменаў цяперашняй ўлады ў Беларусі.

Заснавальнік, тэарэтык і практык ахоўваючага кірунку ў беларускай тэлежурналістыцы (так сябе характарызуе Зімоўскі) канстатуе, што ў Беларусі назіраецца пагаршэнне эканамічных умоў. Гэта можа выклікаць масавы перавод работнікаў на скарочаны працоўны дзень або адпраўленне ў неаплачваемыя адпачынкі, замарожванне ці паніжэнне заробкаў у дзяржсектары. Да ўнутраных неспрыяльных фактараў дадаецца рост замежных запазычанняў, ціск краін-крэдытораў, недавер да ўрада з боку інвестараў і патрабаванні звонку цалкам перагледзець асноўныя прынцыпы ўнутранай палітыкі. У выніку ўлады вымушаныя пайсці на жорсткія стабілізацыйныя меры, у адказ пачынаюцца лакальныя акцыі пратэсту, якія, па магчымасці, спыняюцца сіламі аховы парадку.

Першай ластаўкай пераменаў можа стаць усеагульны 24-гадзінны страйк, які паралізуе большую частку краіны, зачыняюцца дзяржаўныя ўстановы, спыняецца рух самалётаў, цягнікоў і аўтатранспарту. На хвалі ўнутранай нестабільнасці на палітычнай арэне з'яўляецца «далёкі ад апазіцыі» кандыдат-папуліст, які пад ціскам вуліцы выбівае сабе права ўдзельнічаць у перамовах па газе і транзіце. Пасля змрочнага (без грошай і ацяплення) Новага года, за два тыдні да выбараў прэса абвесціць яго трыумфатарам.

Аптымістычны сцэнар развіцця падзей у палітыцы спадар Зімоўскі пакуль распрацоўвае.

### УЛАДЗІМІР МАКЕЙ



Уладзімір Макей таемна з'ездзіў у Вашынгтон. Там кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта меў сустрэчы з прадстаўнікамі Адміністрацыі Абамы. Мэта гэтага візіту — перакнаць амерыканцаў змяніць палітыку ў дачыненні да Беларусі. СМІ перадаюць інфармацыю, што Уладзімір Макей абяцаў вярнуць у звычайны рэжым працу пасольства ЗША, якое ад сакавіка 2008 года працуе без пасла і з абмежаваным штатам дыпламатычных работнікаў.

На пачатку года часовы паверны ў справах ЗША ў Беларусі Майкл Скэнлан заявіў БелаПАН, што пытанне адмены санкцый у дачыненні да канцэрна «Белнафтахім» сёлета будзе залежаць ад рэальных дзеянняў беларускага боку. У 2008 годзе ЗША прыпынілі дзеянне санкцый у дачыненні да дзвюх кампаній «Белнафтахіма» ў адказ «на пазітыўныя крокі беларускага боку». «У 2009 годзе далейшага паслаблення санкцый не было, бо ў Беларусі не назіралася новых пазітыўных крокаў у сферы правоў чалавека», — зазначыў Скэнлан.

ЗША ўвялі эканамічныя санкцыі ў дачыненні да канцэрна «Белнафтахім» у сувязі з парушэннем правоў чалавека ў Беларусі ў лістападзе 2007 года. У сакавіку 2008-га, пасля таго, як улады Беларусі адмовіліся вызваліць былога кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна (на той момант — апошняга з шасці прызнаных міжнароднай супольнасцю палітвязняў), ЗША ўвялі санкцыі ў дачыненні да ўсіх прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у склад «Белнафтахіма». Мінск і Вашынгтон адклікалі сваіх паслоў для кансультацый. Да сённяшняга дня штаты абодвух пасольстваў скарочаныя да мінімуму.

ПАГРОМ

# ПРАЎДУ АДПРАВІЛІ НА АКРЭСЦІНА

◂ Працяг. Пачатак на стар. 1.




Па-першае, гэта якасць працы беларускай улады, па-другое, актывісты грамадзянскай кампаніі «Гавары праўду» пачалі выпраўляць несправядлівасць, якую ўлада дапусціла ў адносінах да мажліва аднаго з найвялікшых сыноў Беларусі — нашага вялікага пісьменніка і грамадзяніна Васіля Уладзіміравіча Быкава… На працягу толькі дзевяці дзён у Мінску было сабрана больш за 10 тысяч подпісаў пад зваротам да ўладаў перайменаваць адну з вуліц сталіцы ў вуліцу Васіля Быкава. За гэты ж час у Гродна значна меншымі сіламі пад падобным зваротам было сабрана больш за 900 подпісаў… Дасягнутыя тэмпы збору подпісаў былі найвялікшыя за ўсе петыцыйныя кампаніі, якія вяла грамадзянская супольнасць і прадстаўнікі беларускай апазіцыі пасля прыходу да ўлады Аляксандра Лукашэнкі».

Актывіст кампаніі «Гавары праўду» Мікалай Пахабаў прывёў некалькі абуральных прыкладаў таго, як парушалася заканадаўства падчас ператрусаў. «У Бабруйску актывісткі кампаніі Алены Мядзведзевай не было дома, дзверы адчыніла яе ўнучка. Уварваліся прадстаўнікі спецслужбаў і праводзілі вобшук, ламалі шафы наўпрост пры няпоўнагадовым дзіцяці. Выклікалі ўрача-псіхолага, каб тая прысутнічала пры ператрусе. Забіралі ўсё, нават хацелі забраць залатыя пярсцёнкі, але дзяўчынка кінулася да іх і казала: калі вы возьмеце гэтыя пярсцёнкі, якія падарыў тата, я заб'ю вас, — распавёў Мікалай Пахабаў. — Яшчэ адзін прыклад. Яўген Пугач, Смалявічы. Спецслужбы прымусілі прадстаўнікоў пазаведамаснай аховы адчыніць дзверы ў кватэру, увайшлі ў кватэру, дзе нікога не было, забралі ўсю аргтэхніку, зноў зачынілі дзверы і з'ехалі. Гэта папросту дзікунства!»

Эксперта кампаніі «Гавары праўду» Святлану Навумаву таксама дапытвалі 18 мая, а ў яе кватэры адбыўся вобшук. «Гэты палітычны пагром ёсць не што іншае, як даволі высокая адзнака дзейнасці кампаніі, таму што такой масіраванай акцыі запалохвання і гвалту сапраўды даўно не было. Гэта насамрэч стала адказам на нашу петыцыйную кампанію аб перайменаванні вуліц, бо яна пераўтварылася ў сапраўды народнае галасаванне, бо подпісы ставілі самыя розныя людзі, якія належаць да розных палітычных партый, прытрымліваюцца розных палітычных поглядаў. Магчыма, гэта тое самае адзінства, пра якое мы так шмат кажам у апошні час. Мы, праўда, часцей пераважаем казаць пра адзінага, але трэба казаць пра адзінства, і сённяшні прыклад паказвае, што калі мы не будзем адзіныя, то нас усіх пераб'юць паасобку», — адзначыла Святлана Навумава.

## У ізалятары

Падчас прэс-канферэнцыі кіраўнік Беларускай партыі левых «Справядлівы свет» Сяргей Калякін атрымаў інфармацыю пра Сяргея Вазняка і ўмовы яго ўтрымання ў следчым ізалятары на Акрэсціна. Па словах Калякіна, калі сваякі Вазняка праз гучную сувязь звярнуліся да супрацоўніка ізалятара часовага ўтрымання з просьбай прыняць для вязня перадачу, паследаваў адказ: "Вазняк — бандыт, ён у кайданках і яму нічога не палажана…»

«Ужо без суда і следства яны вызначылі, як абыходзіцца з гэтымі людзьмі! — абураўся Калякін. — Праўда, потым яны прынялі рэчы, але ўвага да тых людзей, якія сёння знаходзяцца ў беларускіх умовах утрымання, і тое свавольства, якое робіцца ў дачыненні да іх, мусіць зрабіцца клопатам усіх — і праваабаронцаў, і журналістаў, і палітыкаў, і кіраўнікоў грамадзянскіх ініцыятыў».

Як адзначыў Аляксандр Фядута, зараз ідзе спроба шантажу беларускай уладай заходняй супольнасці. «Маўляў, альбо вы робіцеся легітыматарам, альбо тут будзе не рэпрэсіўна-таталітарная дзяржава, а сапраўды дыктатура. Я думаю, што гэта вельмі няўдалы шантаж, і Захад другі раз размаўляць у тых тонах, у якіх размаўляў у той час, калі ў турме сядзеў Аляксандр Казулін, не будзе, Захад больш не будзе такім мяккім… Адначасова Лукашэнка паспрабаваў шантажаваць і Расію, маўляў, вось мы возьмем усю апазіцыю і пакажам яе сувязі з Расіяй. Нічога паказаць немагчыма, таму што сувязей з Расіяй няма, але гэта таксама сведчыць пра тое, што і з усходняга боку рэжым адчувае небяспеку. І зараз тое, што робіць Аляксандр Лукашэнка, дэманструе нават не Захаду, нават не грамадзянскай супольнасці Беларусі, а дэманструе дзяржаўнаму апарату, апарату беларускіх праваахоўных органаў, таму ж рэпрэсіўнаму апарату, наколькі ён не ўпэўнены ў тым, што будзе заўтра. Акцыя, якая адбылася 18 мая, для Лукашэнкі мае значна горшыя наступствы, чым сустрэча з Курманбекам Бакіевым у Мінску», — падкрэсліў Аляксандр Фядута.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# ГЕЕЎ ПАКУЛЬ ТОЛЬКІ ПАПАЛОХАЛІ

Марыя КРУК

**Спроба правесці ў Мінску гей-парад паказала ўзровень негатоўнасці беларусаў прыняць факт публічнасці і дэманстрацыі прыналежнасці да сексуальных меншасцяў.**




Photo.ByMedia.Net

Тыдзень перад шэсцем і колькі дзён пасля яго беларускі сегмент інтэрнэту як найбольш даступную і свабодную пляцоўку для дыскусій ліхаманіла на тэму таго, ці мае права чалавек з нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыяй гаварыць пра гэта ўголас і ці ўвогуле мае права быць такім. Абагульненыя высновы: хутчэй не, чым так. Прычым такую пазіцыю не цураюцца выказваць ледзь не на афіцыйным узроўні.

Так, на афіцыйным акаўнце мінскага ГУУС у твітэры перад гей-парадам з'явіліся непаліткарэктныя паведамленні з папярэджаннямі аб тым, што шэсце будзе разагнанае. «Амапаўцы раз'юшаныя, і на мясілава заднепрывадных настроеныя асабліва агрэсіўна. Таму трымаецеся далей». Гей-парад, нягледзячы на тое, што час і месца да апошняга моманту арганізатары спрабавалі трымаць у сакрэце, усё ж разагналі. Не больш брутальна, чым разганяюць апазіцыйныя акцыі.

Шэраг беларускіх блогераў, якія бліжэй да ідэй альтэрнатыўных, чым афіцыйных, і, магчыма, самі неаднаразова былі на вулічных акцыях апазіцыі, разгон гей-параду (вельмі сціпленькага па сваіх маштабах) успрынялі на «Ура!», маўляў, іх грошы як падаткаплацельшчыкаў не змарнаваныя. Хаця і самі яны маюць вялікія шансы апынуцца на месцы тых, каго АМАП аператыўна загружае ў аўтазакі.

Сямёра ўдзельнікаў гей-параду правялі выходныя ў спецпрыёмніку-размеркавальніку, у панядзелак суд пакараў іх мінімальнымі штрафамі ў памеры 0,5 базавай велічыні за ўдзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве. Нагадаю, што Мінскі гарвыканкам забараніў шэсце сексуальных меншасцяў, удзельнікі якога планавалі сабрацца ля будынку Белдзяржфілармоніі і прайсці па праспекце Незалежнасці да прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук.

Напярэдадні шэсця Расійскі суаргнізатар гей-шэсця Мікалай Аляксееў заявіў, што «рашэнне мінскіх уладаў аб забароне нашага мерапрыемства з'яўляецца абсурдным і здзеклівым», што ён прыязджаў некалькі разоў у Беларусь і «не адчуваў тут аўтарытарнага рэжыму», таму ўлады маглі б сваім дазволам даказаць Еўропе, што ў краіне не так кепска з правамі чалавека. Да слова, у Мінску ўсё ж прайшло некалькі камерных мерапрыемстваў, звязаных з гей-парадам. Абышлося без адкрытых сутычак, хаця і былі правакацыйныя спробы з боку нязгодных перашкодзіць гэтаму.

За тыдзень да мінскага (Славянскага) гей-параду аналагічнае шэсце пад назвай Балтыйскі гей-парад адбылося ў Вільнюсе. Аднак прыблізна на палове шляху ўдзельнікі былі вымушаныя спыніцца з-за пагрозы бяспекі з боку пратэстуючых. Нязгодныя з маніфестацыяй запусцілі дымавую шашку, свісталі і заклікалі да расправы над удзельнікамі шэсця. І хаця акцыя была спыненая, яе арганізатары назвалі Балтыйскі гей-парад перамогай над гамафобіяй.

У першым у гісторыі Літвы шэсці сексуальных меншасцяў прынялі ўдзел шэраг замежных палітыкаў і праваабаронцаў. Міжнародная праваабарончая арганізацыя «Amnesty International» была прадстаўленая вялікай дэлегацыяй з 70 актывістаў. Праваапарадак у Вільнюсе забяспечвалі каля 800 супрацоўнікаў праваахоўных органаў. На агароджаную тэрыторыю шэсця было забароненае пранасіць некаторыя рэчы, у прыватнасці камяні, палкі, памідоры, яйкі.

У адным з апошніх даследаванняў BISS і лабараторыі аксіяметрычных даследаванняў «НовАК» рэспандэнтам задавалася пытанне: «Ці мусяць абмяжоўвацца правы гомасексуалістаў?» Станоўча на яго адказалі 43 працэнты апытаных беларусаў, яшчэ 19,5 — пагадзіліся ў той ці іншай ступені. На тэрыторыі постсавецкіх краін талерантнасць у пытаннях гендэру, сексуальнай самаідэнтыфікацыі дагэтуль застаецца на нізкім узроўні. Арганізатары Славянскага гей-параду сцвярджаюць, што гэтых жа рамак трымаюцца і дыпмісіі еўрапейскіх краін. Так, былі звароты ў шэраг пасольстваў з прапановай правесці на іх тэрыторыі некаторыя мерапрыемствы, звязаныя з гей-парадам. Але арганізатары гей-параду паўсюль атрымалі адмовы.

Пасля разгону акцыі сексуальных меншасцяў у Мінску «Amnesty International» распаўсюдзіла заяву, у якой выказала шкадаванне з прычыны яе забароны. «Amnesty International» нагадала беларускім уладам, што міжнароднае заканадаўства ў галіне правоў чалавека дакладна вызначае, што свабода сходаў і выказвання распаўсюджваецца на ўсе групы асобаў, уключна з прадстаўнікамі ЛГБТ-супольнасці. Гэтыя правы таксама тычацца перакананняў і меркаванняў, якія могуць стаць абразай для іншых грамадзян. Акрамя гэтага, права на свабоду сходаў і выказвання гарантуецца беларускай Канстытуцыяй.

«Беларускія ўлады мусяць прадэманстраваць большую прыхільнасць да сваіх абавязацельстваў у галіне правоў чалавека, якія недвухсэнсоўна патрабуюць дазволу на правядзенне падобных акцый» — гаворыцца ў заяве эксперта «Amnesty International» па пытаннях дыскрымінацыі ў Еўропе Джона Далузена. — Адмова ўладаў працягвае абуральную практыку непавагі да роўнасці і выканання правоў чалавека ў Беларусі».

ДЫРЭКТЫВА

# НЕБА ЎПАЛА НА ЗЯМЛЮ

Вольга ХВОІН

**Аляксандр Лукашэнка ў сваім штогадовым Пасланні беларускаму народу і парламентарыям заявіў, што краіне неабходны якасны прарыў у эканоміцы. Рэалізацыя на практыцы ідэй Дырэктывы №4 аб далейшай лібералізацыі эканомікі, накіраванай на разняволенне прадпрымальніцкай ініцыятывы, можа кардынальна змяніць дзейсную сістэму гаспадарання і павярнуць краіну ў новае рэчышча эканамічных стасункаў.**




## Разгром

Праект Дырэктывы №4 «Аб мерах па лібералізацыі эканомікі і паляпшэнню дзелавога клімату ў Рэспубліцы Беларусь», які з'явіўся на сайце інтэрнэт-рэсурса «Беларускі партызан», паказвае, што яго аўтары настроеныя арганізаваць рэвалюцыю ў эканамічным сектары. Аднак эксперты і суб'екты, на якіх будзе накіравана дзеянне Дырэктывы №4, да распаўсюджанага дакумента ставяцца больш чым скептычна. Эканаміст Сяргей Чалы дакумент называе «злівам». «Гэта звышрадыкальны план, які раўназначны таму, каб неба ўпала на зямлю. Такі план магчымы да рэалізацыі толькі ў выпадку скрайне кепскай эканамічнай сітуацыі, але гэтага пакуль не назіраецца. Думаю, што яго аўтары неяк звязаныя з прадпрымальніцкімі коламі, магчыма, ідэі былі пазычаныя з нейкіх прапаноў бізнесоўцаў».

Паводле задумы Лукашэнкі і яго атачэння, галоўны прынцып новай стратэгіі дзелавой актыўнасці — канкурэнцыя ўзамен манаполіі. «Эканамічная свабода, абарона правоў уласнасці, адкрытая канкурэнцыя і надзейныя інстытуты рынку — галоўныя фактары ўстойлівага росту дабрабыту краіны, мадэрнізацыі эканомікі і падвышэння якасці жыцця грамадзян, — канстатуюць аўтары Дырэктывы №4. — Глабальны і ўнутраны крызіс абвастрыў неабходнасць актывізацыі структурных рэформаў. Рэсурс старых схем і механізмаў дзяржаўнага інвеставання, вытворчасці і размеркаванні рэсурсаў вычарпаны. Пераадоленне крызісных з'яваў патрабуе гнуткасці інстытутаў і хуткасці прыняцця рашэнняў».

У праекце дакумента канстатуецца факт таго, што цягам апошніх дзесяцігоддзяў была створаная моцная і неэфектыўная сістэма цэнтралізацыі працэсу прыняцця інвестыцыйных, вытворчых і збытавых рашэнняў: «Камерцыйныя арганізацыі пазбаўленыя неабходнай самастойнасці пры арганізацыі вытворчасці тавараў і паслуг. Міністэрствы і канцэрны не спраўляюцца з задачай правядзення якаснага аналізу стану знешніх рынкаў. Яны не падаюць камерцыйным арганізацыям дакладнай маркетынгавай інфармацыі і яшчэ больш павялічваюць рызыкі «адміравання» капіталу». Далей пералічваецца шэраг хібаў дзейснай эканамічнай сістэмы Беларусі: назапашванне інвестыцыйных памылак, пагаршэнне фінансавых паказчыкаў прадпрыемстваў і бюджэту, зніжэнне рэнтабельнасці вытворчасці і продажаў, пагаршэнне плацежаздольнасці дзяржаўных, камерцыйных арганізацый, складаная сітуацыя ў банкаўскай сістэме.

## Што доктар прапісаў?

Рэвалюцыйная Дырэктыва №4 прадугледжвае цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія скіраваныя на вызваленне патэнцыялу ўнутранай эканомікі. Ніжэй пералічаныя найбольш важныя і насамрэч кардынальныя рэформы.

- Скасаваць Камітэт па коштах пры Міністэрстве эканомікі Рэспублікі Беларусь, перадаць функцыю рэгулявання тарыфаў натуральных манаполій міністэрствам. Адмяніць цэнавае рэгуляванне на ўсе тавары, паслугі і працы, за выключэннем тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі, электраэнергію, газ, грамадскі транспарт, паслугі тэлефоннай сувязі (за выключэннем мабільнай), а таксама паслугі, якія прадстаўляюцца дзяржаўнымі арганізацыямі ў сферы аховы здароўя і адукацыі.
- Ліквідаваць практыку адміністрацыйнага вызначэння для вытворцаў розных коштаў на тавары на ўнутраны і на знешнія рынкі, у тым ліку па калійных і азотных угнаеннях, драўніне, паліўна-энергетычных рэсурсах.
- Захаваць дзяржаўнае рэгуляванне ў выглядзе ліцэнзавання, абавязковай сертыфікацыі толькі ў тых сферах, дзе існуе непасрэдная пагроза жыццю і здароўю чалавека.
- Прызнаць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь сапраўднымі сертыфікаты, выдадзеныя прызнанымі ў міжнародным гандлі органамі сертыфікацыі Расіі, краін ЕС, Украіны, ЗША, Японіі, Паўднёвай Карэі без атрымання сертыфікату, які выдаецца органамі сертыфікацыі Рэспублікі Беларусь.
- Распрацаваць праграму поўнага пераходу беларускай прадукцыі на міжнародныя стандарты якасці ISO. Ажыццявіць пераход ад ГОСТов на ISO на ўсе тавары і паслугі да 2014 года.
- Ліквідаваць практыку пазасудовага ўжывання арышту грашовых сродкаў на рахунках і бясспрэчнага спісання іх на падставе загадаў дзяржаўных органаў.
- Адмяніць манаполію нацыянальнага аператара электрасувязі на пропуск міжнароднага інтэрнэт-трафіку, а таксама трафіку паміж іншымі айчыннымі аператарамі электрасувязі.
- Прыняць заканадаўчыя нормы, процідзейныя ўмяшанню ў дзейнасць прыватных суб'ектаў гаспадарання, дыскрымінацыі іх камерцыйнымі структурамі, створанымі органамі дзяржаўнага кіравання.
- Унесці змены ў закон аб прыватызацыі з мэтай паскарэння працэсу трансфармацый уласнасці. Да 2013 года, як мінімум, 75% усіх актываў краіны павінны знаходзіцца ў прыватнай уласнасці.
- Заснаваць Антыманапольны камітэт з шырокімі паўнамоцтвамі кантролю дзеянняў камерцыйных арганізацый, якія займаюць дамінуючае становішча на рынку, праваздзеннем аўкцыёнаў, размяшчэннем дзяржаўных замоў.
- Ліквідаваць інавацыйныя фонды і пазабюджэтныя фонды, што створаныя мясцовымі органамі ўлады.
- Правесці лібералізацыю ўнутранага і знешняга гандлю. Для гэтага адмяніць абмежаванне тэрміна (90 дзён) для правядзення знешнегандлёвых аперацый, адмяніць патрабаванне абавязковага занясення ў дамовы ўказання на мэты куплі тавараў, адмяніць для прадпрыемстваў прыватнай формы ўласнасці патрабавання абавязковай рэшты наяўнасці ў банк і інш.
- Завяршыць прыватызацыю ўсіх аб'ектаў гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання да 2012 года.
- Уніфікаваць мытныя стаўкі, знізіць памер сярэднеўзважанай мытнай пошліны да 3%.
- Занесці неабходныя змены ў акты заканадаўства для прывядзення іх у адпаведнасць з нормамі і стандартамі Сусветнай гандлёвай арганізацыі. Прыняць праграму дзеянняў урада па ўступе ў СГА да 2012 года.
- Правесці лібералізацыю рынку працы і працоўных адносін. Для гэтага надаць індывідуальным прадпрымальнікам, якія працуюць па агульнай схеме падаткаабкладання, права наймаць любую колькасць працаўнікоў, што выплачваюць адзіны падатак — да 5 працаўнікоў не залежна ад родных сувязяў.
- Адмяніць абавязковасць прымянення Адзінай тарыфнай сеткі работнікаў Рэспублікі Беларусь для прадпрыемстваў і арганізацый з доляй дзяржавы ў статутным фондзе менш за 50%.
- Падаць камерцыйным арганізацыям права аптымізаваць занятасць у залежнасці ад рэальнага попыту на тавары, працы і паслугі.
- Правесці лібералізацыю арэндных адносін, палепшыць сістэму кантролю над дзейнасцю камерцыйных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў. Для гэтага паменшыць стаўкі арэнднай платы за памяшканні, вытворчыя плошчы, якія належаць органам рэспубліканскай або мясцовых уладаў, у 2 разы. Скасаваць каэфіцыент «3», які падвышае плату за арэнду офісных памяшканняў. Увесці паніжаючы каэфіцыент 0,2 для ўсіх прадпрыемстваў малога бізнесу, якія арандуюць нерухомасць у органаў рэспубліканскай або мясцовых улад. Ліквідаваць практыку прывязкі ставак арэнднай платы, тарыфаў на паслугі дзяржаўных арганізацый, дзяржаўных і мытных мыт, падаткаў і збораў да замежнай валюты і «базавых велічыняў»; адмяніць прывязку памеру базавай велічыні да стаўкі першага разраду.
- Увесці мараторый на правядзенне ўсіх праверак суб'ектаў малога бізнесу да 1.01.2013 года.
- Палепшыць якасць падаткавага адміністравання, знізіць падатковую нагрузку. Для гэтага:
- Знізіць базавую стаўку падатку на дабаўленую вартасць (ПДВ) да 15%.
- Замяніць адлічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва і падаходны падатак адзіным сацыяльным падаткам 15%.
- Знізіць агульную падатковую нагрузку, уключаючы ўнёскі ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва і мясцовыя падаткі, да 30 % ВУП.

> «Калі б усё, што напісана было рэалізавана, гэта быў бы пераварот. Выкананне апісаных працэдур дало б вялікі ўсплёск прадпрымальніцкай дзейнасці сярод насельніцтва, — лічыць Віктар Гарбачоў

## Здаровы скептыцызм

У прадпрымальніцкіх колах праект Дырэктывы №4 называюць «пераваротным дакументам». «Калі б усё, што напісана было рэалізавана, гэта быў бы пераварот. Выкананне апісаных працэдур дало б вялікі ўсплёск прадпрымальніцкай дзейнасці сярод насельніцтва, — гаворыць лідэр кампаніі «За свабоднае развіццё прадпрымальніцтва» Віктар Гарбачоў. — Але невядома, хто аўтар гэтага дакумента. Думаю, што гэта хутчэй пажаданні, чым насамрэч план дзеянняў. Калі яго аўтары і праўда сядзяць у Адміністрацыі ці ў Мінэканомікі, то ў нас не ўсё страчана. Але ўсё ж выглядае на тое, што распаўсюджаны дакумент накіраваны на перадвыбарчую кампанію. Метад — кінуць чарговую костку, паказаць, якія мы добрыя, маўляў, падумаеце, за каго вам галасаваць».

Лідэр прадпрымальніцкага руху мяркуе, што могуць быць рэалізаваныя некаторыя, самыя простыя пункты праекту: «Магчыма, дазволяць павялічыць колькасць наёмных работнікаў, зменшаць папяровы абарот. Не думаю, што будзе паменшана падатковая нагрузка. Вялікая праблема — штрафныя санкцыі, вось пра гэта трэба нагадваць, плюс высокая арэндная плата».

Віктар Гарбачоў падкрэслівае, што хоць пэўныя паслабленні і рэалізуюцца ў эканамічным сектары, але для дробнага бізнесу яны не надта адчувальныя. «Асноўная частка прадпрымальнікаў гэтых крокаў не заўважае. Усё ж эканамічны крызіс моцна паўплываў на сітуацыю. За апошнія 16 гадоў адносінаў з дзяржавай у нас выпрацаваўся недавер. Калі гавораць, што паслабяць у адным месцы, значыць, падкруцяць у іншым. Я не веру, што Дырэктыва ў такім варыянце будзе прынятая ў поўным аб'ёме», — гаворыць прадпрымальнік.

«Амаль кожны пункт гэтага дакумента закранае інтарэсы ўладных груп, якія кантралююць рэсурсныя плыні. Практыка паказвае, што ў нас рэформы ідуць тады, калі гэта так ці інакш узгадняецца з тымі, хто кіруе працэсам. Гэта не той выпадак, — зазначае эканаміст Сяргей Чалы. — Увогуле, у ідэю лібералізацыі эканомікі праз дырэктыву №4 я веру прыкладна гэтак жа, як у дэмакратызацыю Беларусі праз вайсковы загад».

▸ МЕРКАВАННЕ

# ПРАФЕСІЯ — ПАЭТ

## З НАГОДЫ АДКРЫЦЦЯ КАВАЛЬНІ ТВОРЧЫХ КАДРАЎ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Творчыя колы краіны перуном працяла навіна: у БДУ неўзабаве пачнуць выдаваць дыпломы паэтаў, празаікаў, драматургаў, крытыкаў і перакладчыкаў. У 2010 годзе Інстытут журналістыкі абвясціў пра адкрыццё новай спецыяльнасці — «Літаратурна-мастацкая творчасць». Штогадовы набор складзе 20 чалавек, 5 з якіх паступяць на бюджэтныя месцы. 15 патэнцыйных геніяў будуць абавязаныя плаціць за ars poetica з уласнай кішэні.**




Photo.ByMedia.Net

Наслухаўшыся бясконцых дыскусій пра тое, чым ёсць прафесійная літаратура, я вырашыла пракаментаваць некаторыя самыя папулярныя тэзісы дэбатаў вакол праекта, які ўжо лічаць айчынным адпаведнікам Маскоўскага Літаратурнага інстытута і Вышэйшых літаратурных курсаў пры ім.

***Навучыць пісьменніцтву немагчыма. Складнікі сапраўднай творчасці — талент, высокая маральная якасць і руплівая праца. Індывідуальная.***

Я прыдумала гульню па гісторыі літаратуры. Адна каманда называе імёны вялікіх пісьменнікаў з гуманітарнай адукацыяй, другая — з тэхнічнай або ўвогуле невукаў. Думаю, шанцы на перамогу абсалютна роўныя.

Навучыць пісьменніцтву рэальна: ёсць методыкі і напрацоўкі. Асабліва гэта тычыцца майстэрства перакладу... Але ў «дарослым жыцці» няважна, якім шляхам ты прыйшоў да выніку: за цябе гаворыць «партфоліо». Гэтак жа дыплом журналіста нідзе ў свеце не гарантуе працаўладкаванне ў СМІ. Іншая праблема са штучным кшталтаваннем літаратараў вынікае з агульнай спецыфікі беларускай вышэйшай адукацыі. У 17–18-гадовым абітурыенце можна разгледзець хіба добрага паэта. Схільнасці да прозы, а пагатоў, драматургіі праяўляюцца значна пазней. Цяжкая акалічнасць ва ўмовах, калі радзіме пільна патрэбныя раманісты і сцэнарысты блакбастэраў…

***Знакамітыя пісьменнікі літінстытутаў не скончалі.***

Сярод выпускнікоў Маскоўскага Лiтiнстытута, заснаванага ў 1933 годзе па ініцыятыве Максіма Горкага, — неперапічальная колькасць імёнаў, якія гавораць самі за сябе. Тут і новыя класікі (Генадзь Айгі, Бэла Ахмадуліна, Віктар Астаф'еў) і легенды (Аляксандр Галіч), і зоркі (Віктар Пялевін). З сучасных беларускіх літаратараў — Валянцін Акудовіч, Леанід Дранько-Майсюк. Вышэйшыя літаратурныя курсы скончылі Леанід Галубовіч, Віктар Шніп.

Іншая справа, што ў інтэрнэце можна сустрэць два спісы: «Выбітныя выпускнікі Літінстытута» і «Выбітныя выкладчыкі Літінстытута». Толькі ад спіса №2, які сфармуюць на новай кавальні творчых кадраў, залежыць, ці паўстане з часам спіс №1.

***У Беларусі ўжо ёсць «кузня творчых кадраў» — філалагічныя факультэты БДУ і БДПУ — і ўсе філфакі краіны з імі. Гадаваць літаратараў на факультэце журналістыкі — мякка кажучы, дзіўна.***

Інстытут журналістыкі — адзінае падраздзяленне Дзяржуніверсітэта, дзе ў якасці ўступнага экзамену абітурыенты дагэтуль здаюць сачыненне. З жахам уяўляю сабе групу маладых літаратараў, набраную метадам тэставання па мове і літаратуры, як гэта, верагодней за ўсё, адбылося б на спрадвечным канкурэнце журфака — філфаку БДУ ў яго сучасным стане.

Пры тым, што філалагічны факультэт мае найлепшую базу для падрыхтоўкі пачаткоўцаў да літаратурнай працы, гэты рэсурс марнуецца. Выдатныя выкладчыкі звальняюцца ці раз'язджаюцца па доўгатэрміновых стажыроўках, а сам факультэт на дадзеным этапе — фабрыка па навучанню рускай мове студэнтаў-замежнікаў. На прэстыжнае яшчэ 10 год таму аддзяленне рамана-германскай філалогіі — недабор. Пра новыя, а пагатоў — эксперыментальныя спецыяльнасці няма і мовы.

У той жа час факультэт журналістыкі імкліва пашыраецца і эвалюцыянуе. У піяр-палітыцы робіцца акцэнт на навучанне: а). творчаму пісьму, б). менеджменту СМІ, в). новым медыя-тэхналогіям. Усё гэта не можа не ствараць прывабную карцінку ўстановы ў вачах пішучай моладзі. Ёсць падазрэнні, што хутка само слова «журналістыка» на шыльдзе новага корпуса БДУ на Кальварыйскай будзе замененае на сінонім з агульнейшым значэннем... Ідэалогія?

***Дыпламаваны раман…***

*«…убежать, лишь бы*
*не видеть эти двенадцать*
*светлых иудиных окон*
*на Тверской, не слышать стук*
*счетов, звон сребреников,*
*счет печатных листов»*
***Восіп Мандэльштам***
***пра Маскоўскі Літінстытут***

Найбольшае занепакаенне ў «недыпламаваных» літаратараў і простых чытачоў выклікаў не сам факт адкрыцця новай спецыяльнасці, а тое, што прэса ўпарта звязвае яго з сацзамовай Аляксандра Лукашэнкі на «беларускую «Вайну і Мір». Абсалютна відавочна: ані тых светачаў, якія ўнушаць юнацтву, што такі твор ужо ёсць, і гэта — «Пан Тадэвуш» Адама Міцкевіча, ані тых, хто ўвядзе ў талентавыя вушы, што гістарычныя эпапеі — гэта пазаўчорашняе, а раман як жанр увогуле памёр, да выкладання не дапусцяць. Так ці іначай, першаму крэатыў-набору ў 20 чалавек будзе вельмі няпроста. На гэтых дзяцей загадзя наляпілі цэтлікі «літаратурнага камсамолу», ад якога ў будучыні можна чакаць выключна сервільнага мастацтва.

Застаецца спадзявацца, што, як і было анансавана, палепшыцца хаця б гуманітарная падрыхтоўка студэнтаў журфаку. Бо пакуль што так званая «літаратурная журналістыка», якой там ужо вучаць, пакідае ўражанне клаунады з выкарыстаннем чатырохтомніка Гісторыі беларускай літаратуры ў якасці рэквізіту.

▸ ФЕСТЫВАЛЬ

# ТВОЙ ЖУРНАЛІСЦКІ СТЫЛЬ

Генадзь КЕСНЕР

**21–23 мая ў Гродна збяруцца маладыя журналісты з усёй Беларусі, каб узяць удзел у фестывалі «Твой стыль», арганізатарамі якога выступаюць ГА Цэнтр «Трэці сектар» (Гродна) і ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў».**




У праграме фестывалю — майстар-класы, якія будуць весці знакамітыя вопытныя беларускія журналісты, фотавыстава, розныя прэзентацыі кшталту паказу дакументальных і гульнявых аўтарскіх фільмаў маладых аўтараў, сустрэчы з цікавымі людзьмі, напрыклад, з Андрэем Куцілам — аўтарам і рэжысёрам, удзельнікам міжнародных кінафестываляў і форумаў.

Па словах намесніка старшыні БАЖ Аліны Суравец, у 2007 годзе, калі ладзіўся першы такі фэст (дарэчы, ужо тады ў ім узялі ўдзел больш за 150 чалавек), ён быў задуманы для маладых журналістаў Гродзеншчыны, але гэтым разам ён будзе мець ужо агульнарэспубліканскі характар. «Асноўная ідэя фестывалю — максімальна выкарыстаць той журналісцкі патэнцыял, які ёсць у нас менавіта ў БАЖ, тых класных журналістаў, якія маюць багаты досвед і могуць перадаць яго маладым, таму асноўным элементам гэтага фэсту будуць майстар-класы, якія працягнуцца два дні», — адзначыла Аліна Суравец.

Сярод тэм майстар-класаў — «Майстэрства падрыхтоўкі навін» (яго будзе весці вядомы журналіст АР Юрась Карманаў), «Падрыхтоўка інтэрв'ю» (рэдактар сайту «Заўтра тваёй краіны» Марына Загорская, якая выкладае ў Беларускім калегіуме курсы «Інтэрв'ю» і «Жанравая трансфармацыя інфармацыі»), «Майстэрства быць фотажурналістам» (лаўрэат міжнародных прэмій Андрэй Лянкевіч), «Прафесійная інфармацыйна-пошукавая дзейнасць журналіста» (вядучы — сябра Еўразійскай Акадэміі тэлебачання і радыё (Масква), прафесар Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта (ЕГУ) Эдуард Мельнікаў), «Спецыфіка працы радыёжурналіста» (радыёжурналіст, дацэнт ЕГУ, акрэдытаваны карэспандэнт BBC у Беларусі Таццяна Мельнічук) ды некаторыя іншыя. Па словах Аліны Суравец, праца спланавана арганізатарамі такім чынам, каб маладыя журналісты змаглі наведаць некалькі майстар-класаў.

У межах фестывалю таксама адбудзецца ўзнагароджванне пераможцаў конкурсу маладых журналістаў, які доўжыўся цэлы год. Пераможцы будуць вызначаны ў намінацыях: лепшы фотаздымак, лепшы рэпартаж альбо артыкул, прысвечаны жыццю моладзі, лепшае інтэрв'ю.

Калі вярнуцца да прэзентацый, што маюць адбыцца падчас фестывалю, то звяртаюць на сябе ўвагу наступныя: «Моладзевы інфармацыйны мультымедыйны партал «Твой стыль» , Моладзевая акцыя мультымедыяў «Mam-media» , «Моладзь у дзеянні» (падпраграма Еўрапейскай валанцёрскай службы) — «Магчымасці валанцёрства беларускай моладзі ў краінах Еўропы», а таксама прадстаўленне шэрагу іншых мультымедыйных праектаў.

Як адзначыла намеснік старшыні БАЖ Аліна Суравец, арганізатары прадугледзелі і багатую культурную праграму, каб не засяроджвацца выключна на праблемах журналістыкі. Падчас фестывалю адбудзецца канцэрт маладых, але ўжо вядомых беларускіх гуртоў «Босае сонца» (Мінск), «ZnaROCK» (Мінск), «Nonsense» (Гродна), «Vinsent» (Мінск), таксама пройдзе паказ калекцыі «Твой Стыль» дызайнеркі Юліі Каляды, выстава «У Тваім Стылі» (мастацкая зварка, скульптуры з металу, скраббукінг, вырабы з бісеру).

Дарэчы, пасля ўрачыстага закрыцця фестывалю пройдзе ўганараванне выпускнікоў праекту «Школа маладога журналіста–13», якіх павітае гродзенскі «Пётр Клюеў Бэнд».

# TV ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 24 МАЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05** Nota Bene.
**09.35** «Зорныя танцы». Мужчынскі сезон.
**11.00** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**12.10** Камедыя «Мянялы» (Расія).
**13.45** «OFF STAGE LIFE».
**14.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Культурныя людзі.
**15.55** Здароўе.
**16.20** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.25** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.25** Відэафільм АТН «Прабач мяне».
**18.50, 00.35** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Арэна.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.55** Вострасюжэтны серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-4» (ЗША).
**22.55** Баявік «Атрад выратавання» (ЗША).
**00.40** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** Тэорыя неверагоднасці.
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Тата на ўсе рукі».
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм. IV-ы сезон. 14-я серыя.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Злачынствы стагоддзя».
**23.55** «Мотафрыстайл. Чэмпіянат свету».
**00.50** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** «Вялікі горад».
**15.40** «Гарачы лёд».
**16.05** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Дабро пажаліцца».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.20** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Вялікае каханне». Расія.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Чужы квіток». ЗША, 2000 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Фільм-мюзікл «Аднойчы» (Ірландыя).
**12.05** «Пра мастацтва».
**12.30** Школа рамонту.
**13.30** Прэм'ера. Дакументальны фільм «Расце дуб…» («Беларусьфільм»).
**13.50** Мультфільм.
**14.30** Бухта капітанаў.
**15.10** Тэлебарометр.
**15.25** Серыял «Дзень гневу» (Расія).
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Прыгодніцкі дэтэктыў «Выкрасці ў…» (Расія). 1-я серыя.
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Калыханка.
**21.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.05** Трылер «Клапатлівая сведка» (Германія-Нідэрланды).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.25** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.15** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.25** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.15** Тэлесерыял «Дзве сястры-2». Расія.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**15.20** Фільм «Грахі нашы». Расія, 2008 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**20.25** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія.
**22.20** Тэлесерыял «Панадворак».
**22.55** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**23.50** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**00.05** Навіны - Беларусь.
**00.15** «Весткі+».
**00.35** «Мой срэбны шар».

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** Прэм'ера. «Кропка незвароту. Іосіф Бродскі». Дакументальны фільм.
**09.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.50** Серыял «Сталыпін... Нявывучаныя ўрокі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**14.15** Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.05** «Выратавальнікі».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыў «Вярнуць на дасследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Бомж».
**22.25** Серыял «Час Волкава».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Сумленны панядзелак».
**00.40** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Навіны Адкрытага чэмпіянату Францыі.
**09.45** Мотаспартыўны часопіс.
**10.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Монца (Італія). 3-і этап. Гонка 2.
**10.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Дзень 1.
**11.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**12.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Дзень 2.
**21.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.30** Вось дык так!!!
**23.45** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**00.15** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**00.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.45** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Дзень 2.
**02.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял.
**17.35** Госць «Белсату».
**17.50** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.50** Невядомая Беларусь: «Чарнобыль для Еўропы», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Еўропа сёння.
**20.10** ПраСвет.
**20.25** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Партызанская школа», дак. фільм, 2002 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Прыватная калекцыя.
**21.40** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**21.55** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**22.05** Фільматэка майстроў: «Апошні імператар», маст. фільм, 1987 г., Вялікабрытанія–Кітай–Гон-Конг.
**00.40** Аб'ектыў.

## 25 МАЯ, АЎТОРАК

### 1

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Арэна.
**09.05** Вострасюжэтны дэтэктыў «Права на памілаванне». Заключная серыя.
**09.55** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**10.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**11.40** Відэафільм АТН « Шэпт столінскай багны « цыклу «Зямля беларуская».
**12.10** Меладрама «Сюрпрыз».
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Уласны персанал.
**15.55** Дэтэктыўны серыял «Заганы і іх прыхільнікі» (Расія). 1-я серыя.
**16.50** Серыял «Агульная тэрапія» (Расія).
**17.55** Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
**18.50, 00.00** «Зона Х». Крымінальная хроніка.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Сфера інтэрэсаў.
**19.55** Прэм'ера. Дэтэктыўная меладрама «Сівер» (Расія-Украіна). 1-я серыя.
**21.00** Панарама.
**22.00** Першы паўфінал Міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне-2010». Прамая трансляцыя.
**00.05** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Гарады-героі. Адэса».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў +».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.45** «Кантрольны закуп».
**15.15** Прэм'ера. «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Хай кажуць».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Серыял «Тата на ўсе рукі».
**18.55** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Шлюб па завяшчанні». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**22.10** Прэм'ера. «Праўда хавае хлусню». Шматсерыйны фільм.
**23.20** Нашы навіны.
**23.35** Навіны спорту.
**23.40** «Дакументальны дэтэктыў».
**00.15** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** Фільм «Вялікае каханне». Расія.
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Анёл-захавальнік». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Мачаха». Серыял.
**13.50** «Гучная справа».
**14.40** «Свая каманда». Моладзевы серыял.
**15.40** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Мачаха». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Прэм'ера! «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**21.30** Прэм'ера! «Асабістая справа капітана Руміна» Серыял.
**22.55** «Рэпарцёр СТБ».
**23.25** «Аўтапанарама».
**23.45** Фільм «На цвярозую галаву». ЗША.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**08.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**09.30** У гэты дзень.
**09.35** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**10.35** Прыгодніцкі дэтэктыў «Выкрасці ў…» (Расія). 1-я серыя.
**11.30** «Запал па культуры».
**12.15** Дакументальна-гістарычны серыял «Мяжа. Рэч паспалітая» (Беларусь).
**12.45** Дакументальны фільм «Успамінаючы Чарняхоўскага» («Беларусьфільм»).
**13.05** Трылер «Клапатлівая сведка» (Германія-Нідэрланды).
**14.50** Свая кампанія.
**15.25** Серыял «Дзень гневу» (Расія).
**16.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.25** Простыя практыкаванні з Ю.Афанасьевым (Расія).
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.05** Прыгодніцкі дэтэктыў «Выкрасці ў…» (Расія). 2-я серыя.
**20.05** Беларуская часіна.
**21.15** Калыханка.
**21.30** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.05** Спорт-кадр.
**22.35** Авантурная камедыя «Сіньёр 15 шароў» (Італія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне».
**10.10** «Наша АББА». Дак. фільм.
**11.00** Весткі.
**11.25** «Нічога асабістага».
**11.40** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**12.35** Тэлесерыял «Дзве сястры-2». Расія.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.25** «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял.
**15.15** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.15** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Прэм'ера. «Карменіта. Цыганскі запал». Тэлесерыял. Расія, 2009 г.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аднойчы будзе каханне». Расія, 2008 г.
**20.25** Тэлесерыял «Пуцявікі». Расія, 2008 г.
**22.20** Прэм'ера - 2010. Тэлесерыял «Панадворак».
**22.55** Прэм'ера. «Тэрыторыя прыгажосці». Тэлесерыял. 2009 г.
**23.50** Навіны - Беларусь.
**00.00** «Весткі+».
**00.20** «Пад купалам цырка. Смяротны нумар». Дакументальны фільм.

### НТВ

**07.00** Сёння.
**07.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.30** «І зноў добры дзень!».
**09.30** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Сярэдні клас».
**10.55** «Кватэрнае пытанне».
**11.55** Серыял «Сталыпін... Нявывучаныя ўрокі».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**14.20** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Знакі лёсу».
**15.10** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыў «Вярнуць на дасследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Бомж».
**22.25** Серыял «Час Волкава».
**23.25** Сёння.
**23.50** «Галоўны герой прадстаўляе…».
**00.35** «Фатальны дзень».

### EUROSPORT

**09.30** Навіны Адкрытага чэмпіянату Францыі.
**09.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 15.
**10.30** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Дзень 2.
**11.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**12.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 3.
**16.25** Веласпорт. «Планета Армстронг». Часопіс.
**16.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 16.
**18.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**18.40** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Дзень 3.
**21.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**22.00** Футбол. Моладзевы фэст да 23 гадоў. Тулон (Францыя). 1/2 фіналу.
**23.45** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе Турынг. Часопіс.
**00.15** Мотаспартыўны часопіс.
**00.30** Футбол. Кубак свету-2010. Прэзентацыя краін-удзельніц. Часопіс.
**00.45** Бокс. Міжнародны паядынак. ЗША.
**02.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Ранча Пікова Сямёрка», серыял.
**17.35** МакраФон: Канцэрт Змітра Вайцюшкевіча ў тэатры «Буфо», ч. 1.
**18.10** Басанож па свеце: 14 серыя.
**18.50** Тыдзень з радыё «Свабода».
**19.10** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**19.25** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Праект «Будучыня».
**20.10** Акно ў Еўропу.
**20.40** Хто ёсць кім?: Беларусь – мой музей. Анатоль Белы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сальда (эканамічная праграма).
**21.35** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**21.45** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**22.30** Форум (ток-шоу): «Што мы ямо?»
**23.10** Аб'ектыў.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 30 МАЯ, НЯДЗЕЛЯ

**07.45** Мультфільм «Канёк-Гарбунок» (СССР).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.05** «Арсенал».
**09.35** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.50** «Альманах вандраванняў».
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.50** «У свеце матораў».
**11.25** «Nota Bene».
**12.10** Камедыя «Баламут» (СССР).
**14.00** «ПАР-2010. Вяртанне чэмпіёна».
**14.30** Хранікальна-дакументальны фільм «Гарачыя кропкі» (Беларусь).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** «У чаканні Мундыаля».
**15.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў.
**16.30** Спартовая драма «Жэрабя» (СССР).
**18.00** Суперлато.
**19.15** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.15** «OFF STAGE LIFE».
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** «У цэнтры ўвагі».
**22.10** Дэтэктыў «Шызафрэнія» (Расія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2008 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.10** «Шчасце ёсць!».
**12.00** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.35** «Фазэнда».
**13.15** «Разумніцы і разумнікі».
**14.00** «Песні Перамогі».
**14.30** «Градка».
**15.05** Тэорыя неверагоднасці.
**15.50** Футбол. Таварыскі матч. Беларусь - Паўднёвая Карэя (у перапынку «Нашы навіны»).
**17.55** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Тула».
**18.55** Прэм’ера АНТ: «Давай ажэнімся!».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** «Вялікая розніца».
**22.45** Драма «На мяжы стаю…».
**00.30** «Паўднёвае Бутава».

**07.05** «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
**07.55** Фільм «Гарадскі паляўнічы». Японія - Ганконг, 1993 г.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.15** «Добры дзень, доктар!».
**13.45** «Дарагая перадача».
**14.00** Фільм «Беражыце жанчын». СССР, 1981 г.



**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёр СТБ».
**17.20** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Гаспадары ночы». ЗША, 2007 г.
**22.50** «Прафесійны бокс».
**23.25** Фільм «Каровы». Іспанія, 1992 г.
**01.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.05** Дабравест.
**07.30** Мір вашай хаце.
**07.40** Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
**08.10** Музычная меладрама «Брудныя танцы» (ЗША).
**09.50** Школа рамонту.
**10.55** Медычныя таямніцы.
**11.40** Кінаспробы.
**12.00** Бухта капітанаў.
**12.40** «Правы чалавека».
**12.55** Прэм’ера. Прыгодніцкая кінааповесць «Спадчыннікі» (Расія).
**14.50** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**15.55** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Адборачны раўнд. Жанчыны. Беларусь-Славенія. Прамая трансляцыя.
**17.30** Прыгодніцкая камедыя «Кевін з поўначы» (Канада- Вялікабрытанія).
**19.20** Нашы тэсты.
**19.55** Смешная часіна.
**20.35** Тэлебарометр.
**20.55** Экспедыцыя.
**21.25** Драматычны трылер «Выкуп» (Канада-Вялікабрытанія).
**23.10** Свая музыка. Працяг.
**23.40** Прасоўванне+.

**07.00** Фільм «Ванечка». Расія, 2007 г.
**09.20** Фільм «Што хавае каханне». Расія, 2010 г.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.15** Фільм «Вячэрні варыянт».
**14.00** Весткі.
**14.15** Фэст дзіцячай мастацкай гімнастыкі «Аліна».
**15.45** Фільм «Аднойчы дваццаць гадоў пасля».



**17.10** «Дарослыя і дзеці» у гасцях у праграмы «Дабранач, маляняты!».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** Канцэрт В.Меладзэ «Акіян».
**22.00** Фільм «Рассмяшыць Бога».
**23.40** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.40** Камедыя «Рэальны тата». Расія, 2008 г.



**05.55** Трылер «Флэш. ка».
**07.40** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.20** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.30** «Першая кроў».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** Прэм’ера. «Лепшы горад Землі».
**14.10** Трылер «Флэш. ка».
**16.00** Сёння.
**16.25** Прэм’ера. «Масквічы».
**17.20** «І зноў добры дзень!».
**18.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**19.55** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.30** Прэм’ера. Дэтэктыўны серыял «Шэрыф».
**00.00** «Авіятары».
**00.35** «Асабліва небяспечны!».

**09.30** Навіны Адкрытага чэмпіянату Францыі.
**09.45** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 20.
**10.30** Футбол. Кубак свету. ПАР. Таварыскія матчы. Агляд.
**11.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**12.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Дзень 8.
**16.30** Веласпорт. Нацыянальны тур. Тур Італіі. Этап 21.
**19.00** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Дзень 8.
**21.30** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.
**22.00** Футбол. Кубак свету. ПАР. Таварыскія матчы. Агляд.
**23.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы да 17 гадоў. Вадуц (Ліхтэнштайн).
**00.00** Настольны тэніс. Камандны Чэмпіянат свету. Масква (Расія). Фінал.
**01.00** Матаспартыўны часопіс.
**01.15** Тэніс. Турнір Вялікага шалома. Адкрыты чэмпіянат Францыі. Парыж (Францыя). Дзень 8.
**02.00** Тэніс. «Гейм, сэт і Матс». Часопіс.

**17.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.20** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**17.30** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.35** «Эпоха Барадуліна», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.30** «Аблавушак», мультсерыял.
**19.40** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**20.00** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма): 18 серыя.
**20.30** Акно ў Еўропу.
**21.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».
**21.30** Фільматэка майстроў: «Між двух берагоў», маст. фільм, 1995 г., Вялікабрытанія–Бельгія–Францыя.
**23.00** Тыдзень у «Аб’ектыве».

# Шаноўныя чытачы!

**Пры афармленні падпіскі будзьце ўважлівымі: з 1 мая змяніліся нашы рэквізіты ў банку. Нумар рахунку: 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Падпісацца можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк.**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

БЕЛПОЧТА
ф. ПС 112
ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД
№ ______ (вход, по карте отправки)
ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐
(сумма цифрами) (сумма прописью)
ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926
КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
(почтовый код, адрес получателя, телефон)
ОТПРАВИТЕЛЬ ______
(почтовый код, адрес отправителя, телефон)
АДРЕС ______
Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное
(назначение платежа)
(письменное сообщение)
Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Ідзем у адзяленне банка і на адмысловым бланку пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
2. Указваем суму аплаты і здзяйсняем пералік грошай.
3. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
4. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

КВИТАНЦИЯ
ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Вид платежа | Дата | Сумма
Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

## Для тых, хто прымае рашэнні!

Новы час

www.novychas.org

КАМЕНТАРЫ

# КАЛМЫКІ Ў КОСМАСЕ

Алег ПЯТРОЎ



**Сярод тэмаў, якія найбольш дыскутуюцца зараз у Расіі, споведзь прэзідэнта Калмыкіі Кірсана Ілюмжынава. Калмыцкі гарант расказаў пра свой кантакт з прадстаўнікамі пазазямных цывілізацый. Прапануем агляд блогаў і каментараў на гэту тэму.**

Напрыканцы красавіка прэзідэнт Калмыкіі, старшыня Міжнароднай шахматнай федэрацыі (ФІДЭ) Кірсан Ілюмжынаў, калі быў госцем праграмы «Познер» на Першым расійскім канале, падрабязна распавёў пра сустрэчу з гуманоідамі. Па словах Ілюмжынава, іншапланецяне наведалі яго ў верасні 1997 года. Ён прыехаў суботнім вечарам у сваю маскоўскую кватэру, пачытаў кнігу, пагладзеў тэлевізар, ужо збіраўся ў ложак, але тут адчуў, што з адчыненага балкона яго хтосьці кліча. Калі Ілюмжынаў выйшаў на балкон, то ўбачыў там напаўпразрыстую жоўтую трубу. Ён увайшоў у яе. У сярэдзіне былі людзі ў жоўтых скафандрах.



Размаўляў Кірсан з гуманоідамі на ўзроўні думкі, паколькі, па яго словах, «яму трошкі бракавала кіслароду». Іншапланецяне апынуліся гасціннымі, правялі калмыцкаму прэзідэнту экскурсію па караблі і пасля адпусцілі. Яны таксама заявілі, што да сустрэчы з астатнім чалавецтвам пакуль не гатовыя, таму і не выходзяць на кантакт.

Тэма кантакту галоўнага шахматыста Расіі з іншапланецянамі хутка атрымала сваё развіццё. Дэпутат пецярбургскага парламента ад ЛДПР Алена Бабіч прызналася, што ва ўзросце 18 гадоў бачыла «велізарны серабрысты шар, які павольна плыў па небе, пакідаючы за сабою перламутравы шлейф». Уражанне ад кантакту з пазазямным аб'ектам апынулася настолькі моцным, што юная Алена страціла прытомнасць. «Шкада, што тады я была адна, і ніхто не змог пацвердзіць з'яўленне прышэльцаў», — скардзіцца прэсе спадарыня Бабіч. Адзначым, што гэта тая самая Алена Бабіч, якая прыпісвае сабе выгнанне злых духаў з Інжынернага замку ў Піцеры.

А дэпутат Дзярждумы РФ (што характэрна, таксама ад ЛДПР) Андрэй Лебедзеў напісаў ліст прэзідэнту Мядзведзеву, у якім просіць растлумачыць, ці існуе ўсталяваны рэгламент інфармавання вышэйшых службовых асоб краіны пра сустрэчы з іншапланецянамі? Яму ў дадатак цікава, ці дакладваў лідэр Калмыкіі ў адміністрацыю прэзідэнта РФ пра свае кантакты і ці не раскрыў той пад выглядам нявіннай гутаркі з гуманоідам якую-небудзь сакрэтную дзяржаўную інфармацыю. Акрамя таго, як мяркуе Лебедзеў, неабходна ўсіх кіраўнікоў рэгіёнаў праверыць не толькі на фізічнае, але і псіхічнае здароўе.

Дзмітрый Мядзведзяў на запыт пакуль не адрэагаваў, а вось блогасфера ўжо паспела пракаментаваць апісаныя падзеі.

«Можа, паліў Кірсан нешта? Ці Познер у сваім інтэрв'ю чалавека давёў? Хаця, хто ведае, што там у Калмыкіі?» — будуе здагадкі блогер chorni-tylpan.

«А кажуць, што шахматы не пахнуць», — дзівіцца zloykoala.

«Я вам скажу так… у Калмыкіі ёсць штосьці незямное, — запэўнівае artdan. — Хто там быў, той пацвердзіць».

«Ён жа прэзідэнт ФІДЭ і вялікі аматар шахмат. Можа, яны па часткі шахмат прыляталі?» — прапануе сваё тлумачэнне загадкавым падзеям pigh.

Яшчэ далей ідзе ў разважаннях cobelsky: «А што калі гэта ўжо не Ілюмжынаў? А іншы (чужы, грэмлін, дарт вейдер, грамазека)? Трэба медкамісію прызначыць пад кіраўніцтвам Анішчанкі (галоўны эпідэміёлаг Расіі). Будзе вельмі цікава».

«Забыўся, што гаворыць, або падсеў на наркотыкі. Здаецца, псіхічнае здароўе прэзідэнта Кірсана Ілюмжынава дае збой?» — разважае dicaine. Ён жа піша: «Вось вы, для прыкладу, часта бачыце іншапланецян ці, можа, вашы знаёмыя маюць адносіны з імі? Што будзе з краінай, калі ў яе кіраўніцтва ўваходзяць палітыкі кшталту Ілюмжынава? Сёння яны ўступаюць пад уплывам наркотыкаў у кантакт з іншапланецянамі, а заўтра у іх ломка пачнецца?»

Блогер feliks160653 мяркуе, што адкрыццё Ілюмжынава і запыт Лебедзева — прыкметы дэградацыі расійскай улады: «Хацеў бы заўважыць, што спадар Ілюмжынаў кіруе рэгіёнам на працягу апошніх 17 гадоў, і за гэты час ён мог «перадаць» велізарную колькасць расійскіх дзяржаўных сакрэтаў у пазазямную прастору. Здаецца, яны абодва ку-ку на ўсю галаву. Цікава, а наогул ці ёсць там, ва ўладзе, нармальныя людзі? Я вось не ведаю. На гэта пытанне адказаць вельмі цяжка, назіраючы за падзеямі, якія ў Крамлі перыядычна адбываюцца».

Па меркаванні prometheus, заклапочанасць выклікае толькі псіхічны стан Ілюмжынава, а вось Лебедзеў паступіў адэкватна: «Дэпутацкі запыт Лебедзева на адрас прэзідэнта Мядзведзева з нагоды рандэву Ілюмжынава з іншапланецянамі — нармальная фармальная рэч. Па сутнасці — гэта правільна. У лепшыя часы Ілюмжынаў атрымаў бы хуткую і кваліфікаваную дапамогу з боку дактароў карнай псіхіятрыі. Калі палітычныя лідэры робяць такія заявы, яны істотна паніжаюць інтэлектуальную планку сваіх народаў і ўзровень даверу да дзяржавы».

Шэраг аўтараў не лічаць хворым Ілюмжынава. Яго словы яны тлумачаць далёка ідучымі планамі. «Не сумняваюся, што гэта не шыза. Ілюмжынаў у размове з Познерам трымаецца ўпэўнена, ён не ўзбуджаны. Добра кантралюе эмоцыі. Наогул, ён вельмі разумны. Але… не будзем забываць, што Ілюмжынаў таксама будыст. Верагодна, палёт да іншапланецян — нейкае іншасказанне, — піша Аляксей Камольцаў, і дадае: «Папросту дэбют для піяр-кампаніі: падняць шум, нагадаць пра сябе. Лічу таксама, што гэта можа быць прыгожае пахаванне сваёй палітычнай кар'еры, урачыстае палітычнае самагубства».

Імкненнем працягнуць кар'еру тлумачыць выступ Ілюмжынава Дэн Шорын: «Гаворка ідзе не пра выбары губернатара. Цяпер праходзяць выбары прэзідэнта міжнароднай шахматнай федэрацыі ФІДЭ, і на гэтых выбарах вельмі цікавая раскладка. Большасць краін, дзе шахматы традыцыйна модныя, падтрымліваюць 12-га чэмпіёна свету Анатоля Карпава. А вось расійскія службоўцы, падобна, не ведаюць, хто такі Карпаў і колькі ён зрабіў для шахмат. Расійская шахматная федэрацыя афіцыйна высунула на пасаду старшыні ФІДЭ цяперашняга прэзідэнта, функцыянера Кірсана Ілюмжынава. І яшчэ ў дадатак, як высвятляецца, яго падтрымліваюць іншапланецяне».

Вось такія меркаванні. Тым часам па інтэрнэту ўжо пачала хадзіць інфармацыя пра тое, што іншапланецяне афіцыйна аспрэчылі заяву Ілюмжынава пра кантакт з імі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

З кіргізскага боку ўвоз цукру кантраляваўся сям'ёй Бакіевых і дэпутатам кіргізскага парламента Сяргеем Ібрагімавым. У Беларусі экспарт цукру цалкам знаходзіцца ў сферы дзяржаўнага рэгулявання, што таксама сімвалізуе падкантрольнасць якога-небудзь бізнесу, які прыносіць мільённыя прыбыткі аднаму чалавеку або яго сваякам. У сувязі з гэтым акрэсліваюцца некаторыя спецыфічныя прычыны «гасціннасці» беларускага кіраўніка і надання прытулку выгнанаму з уласнай краіны Бакіеву.

**«Дело №» (Кыргызстан)**

У Макея рэпутацыя чалавека, які можа спадабацца заходнім палітыкам. Ён ведае, што хочуць пачуць на Капіталійскім пагорку і ў Белым доме. У сітуацыі, калі напруга на ўсходнім фронце ўзрастае, Лукашэнка вымушаны падбіраць словы і раздаваць абяцанні Вашынгтону і Бруселю. Такая тактыка, па меркаванні стратэгаў з Чырвонага дома, павінна аслабіць расійскі ціск і стварыць адчуванне ў самой Беларусі, нібыта ў Лукашэнкі няма праблем з Захадам.

**«Delfy» (Літва)**

Як паказвае практыка правядзення выбараў у Беларусі, падлік галасоў — «канёк» беларускай выбарчай машыны — не з'яўляецца неабходнай умовай прызнання выбараў і новай улады легітымнымі. Гэта толькі перадумова. Неабходным фактарам з'яўляецца забеспячэнне знешнепалітычнай легітымнасці выбараў з боку аднаго з вядучых сусветных цэнтраў — ЗША, ЕС ці Расіі. У Беларусі легітымнасць забяспечваецца выключна прызнаннем з боку Расіі, пасля якой пачынаюцца прызнанні з боку дзяржаў СНД, КНР і іншых краін. У сувязі з гэтым афіцыйны Мінск зацікаўлены ў тым, каб Масква заняла нейтральную пазіцыю ў стаўленні да беларускіх выбараў і не ўмешвалася ў іх ход. Па-другое, каб Масква пасля правядзення выбараў заявіла пра прызнанне іх вынікаў у той інтэрпрэтацыі, у якой іх будзе агучваць афіцыйны Мінск. І, па-трэцяе, галоўнае — каб Масква на гэтых выбарах не выставіла свайго кандыдата.

**«Regnum» (Расія)**

Адкліканне з Бішкеку беларускіх дыпламатаў звязана не столькі з пагрозай бяспекі, колькі з жаданнем падняць на іншы, больш высокі ўзровень, цяперашнія відавочна ненармальныя адносіны паміж Мінскам і Бішкекам. Такая рэакцыя наўрад ці адпавядае нацыянальным інтарэсам Беларусі. Краіны СНД чакаюць легітымнасці новай кіргізскай улады, у тым ліку і Масква. Кіргізская тэма з'яўляецца і тэмай двухбаковых адносін Мінска з Масквы. Крэмль загадкава пакідае без каментараў шматлікія жорсткія заявы Лукашэнкі па гэтаму і іншых пытаннях. Такія паводзіны Масквы могуць стымуляваць апазіцыйныя настроі не столькі сярод грамадзян, колькі ў асяроддзі беларускай наменклатуры.

**«Delfy» (Літва)**

Мабыць, эканамічная сітуацыя такая цяжкая, што краіне як паветра патрэбны замежныя інвестыцыі, асабліва ў сферы, злучанай з сельскай гаспадаркай, якая забяспечвае значны працэнт працоўных месцаў у Беларусі. Так што калі яшчэ год таму Лукашэнка з-за «малочнай вайны» мог адмяняць свой візіт у Расію, то ў 2010-м ён спадзяецца на паспяховую рэалізацыю еўрабонусаў і заплюшчвае вочы на паўзучае пранікненне расійскага бізнесу ў яго краіну. Сацыяльная стабільнасць даражэй. А ўласна беларускага бюджэту на яе падтрыманне хуткім часам можа і не хапіць.

**«Росбалт» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ФРАНЦЫЯ. ГАДАВІНА СМЕРЦІ ЛЮБІМАГА КАРАЛЯ

Французы — перакананыя рэспубліканцы. Аднак нягледзячы на гэта зараз яны аддаюць даніну павагі Генрыху IV Наварскаму, які кіраваў краінай з 1589 па 1610 год. Генрых прызнаны самым папулярным з усіх французскіх манархаў. Шмат выданняў зрабілі тэмай тыдня юбілей забойства Генрыха (яго забіў каталіцкі фанатык на парыжскай вуліцы). А самы папулярны штотыднёвік «Nouvel Observateur» увогуле назваў Генрыха IV лепшым адміністратарам у гісторыі краіны. За 200 гадоў да штурму Бастыліі кароль зрабіў, па нашых мерках, неверагоднае — прымірыў пратэстантаў і каталікоў. У 1589 годзе Генрых IV выдаў славуты Нанцкі эдыкт, што гарантаваў вернікам абедзвюх канфесій роўныя правы. Акрамя таго, ён шмат зрабіў для развіцця эканомікі і інфраструктуры дзяржавы, нават заклаў асновы для развіцця сістэмы сацыяльнай абароны. Генрых IV заявіў, што яго жыццёвая місія заключаецца ў тым, каб звычайная французская сям'я магла дазволіць сабе кожны тыдзень есці курыцу. Трэба адзначыць, што пра нябожчыка згадваюць галоўным чынам левыя апазіцыйныя выданні. Відавочна, каб укалоць цяперашняга прэзідэнта Нікаля Сарказі, які на фоне Генрыха Наварскага, на іх погляд, поўны нуль.

**Па матэрыялах «Guardian» (Вялікабрытанія)**

### ТУРКМЕНІСТАН. ТУРКМЕНАМ ДАЗВОЛЕНА БЫЦЬ АПАЗІЦЫЯНЕРАМІ

Прэзідэнт Туркменістана абвясціў пра пачатак фармавання ў краіне шматпартыйнай сістэмы. Упершыню ён выступіў з падобнай ініцыятывай у лютым. «З'яўленне ў нашай краіне апазіцыйнай партыі стане важнай падзеяй у грамадска-палітычным жыцці краіны», і «калі хтонебудзь мае жаданне стварыць новую палітычную партыю і выйдзе з гэтай ініцыятывай, то, у адпаведнасці з Канстытуцыяй, мы гатовыя новую партыю зарэгістраваць», — сказаў прэзідэнт. Будучыя партыі павінны скласці канкурэнцыю на гэты час адзінай у краіне Дэмакратычнай партыі. Аднак эксперты мяркуюць, што палітычная перабудова ў Туркменістане будзе хутчэй дэкларатыўнай. Прынамсі дасюль ніводнай заяўкі ў Мінюст пададзена не было.

**Па матэрыялах туркменскіх сайтаў**

### ІНДЫЯ. ГУЛЬНІ БРЫТАНСКАЙ САДРУЖНАСЦІ

Прадстаўнікі грамадскай арганізацыі «Housing and Land Rights Network» абвінавацілі ўлады Індыі ў тым, што дзесяткі мільёнаў долараў, якія былі выдзеленыя на барацьбу з беднасцю, пайшлі ў фонд арганізацыі Спартовых гульняў Брытанскай Садружнасці. У асноўным на тыя грошы планавалася пабудаваць дамы для бяздомных індусаў. Арганізацыя таксама патрабуе пачатку незалежнага следства па справе выкрадання грошаў. У сваю чаргу ўрад усе абвінавачанні лічыць беспадстаўнымі. Тым не менш ААН ужо афіцыйна асудзіла Індыю за тое, што прыярытэт аддаецца не сацыяльным пытанням, а спартовым праектам. Ахвярамі палітыкі фінансавання спартовых мерапрыемстваў стануць, па падліках спецыялістаў, 40 тысяч бяздомных сямей.

**Па матэрыялах індыйскай прэсы**

### ГРУЗІЯ. ВАЙНУ ГРУЗІН І РУСКІХ СПРАВАКАВАЛІ КУРДЫ

Такую версію падзей жніўня 2008 года прапанаваў Аляксандр Русецкі, дырэктар Паўднёвага каўказскага інстытута рэгіянальнай бяспекі. Па яго словах, менавіта баевікі Курдскай рабочай партыі, якая дабіваецца выхаду са складу Турцыі курдскіх правінцый і стварэння на іх базе незалежнай дзяржавы, узарвалі 5 жніўня 2008 года нафтаправод Баку — Тбілісі — Джэйхан. Мэтай тэракту быў падрыў паставак ў Турцыю каспійскай нафты. Аднак грузіны, па словах Русецкага, чамусьці курдскі след ігнаравалі. У Тбілісі вырашылі, што выбух арганізавалі расійскія спецслужбы і пачалі падрыхтоўку атакі на Цхінвалі. Што было далей, усе ведаюць. Праўда, сам аўтар версіі не выключае, што курды маглі дзейнічаць па замове Масквы, якая падтрымлівае курдскі рух у Турцыі і Іране яшчэ з часоў СССР.

**Па матэрыялах «Грузія сегодня» (Грузія)**

### ЧЭХІЯ. ФІЛЬМ ПРА ПАГРОМЫ СУДЗЕЦКІХ НЕМЦАЎ

Па чэшскаму дзяржаўнаму тэлебачанні паказалі дакументальны фільм «Забойства па-чэшску» журналіста Давіда Вондрачка. Стужка прысвечана забароненай доўгі час у чэшскім грамадстве тэме — рэпрэсіям супраць мірнага нямецкага насельніцтва ў 1945 годзе. Як вядома, на тэрыторыі Чэхаславакіі да вайны пражывала шмат этнічных немцаў, што стала для Гітлера повадам для акупацыі Чэхаславакіі. У маі 1945-га прыйшоў час расплаты, ахвярамі якой былі не толькі нацысты. У некаторых гарадах чэшскія паўстанцы забілі да некалькіх сотняў немцаў. У фільме паказаны знятыя ў 1945 годзе ў Празе кадры. На экране група чэхаў ставіць да сценкі некалькі дзесяткаў нямецкіх абывацеляў. Пасля трупы забітых грузяць у машыну. Кадры былі знятыя аматарам, які да падзення камуністаў баяўся іх паказваць. Фільм выклікаў пазітыўную рэакцыю ў Германіі, дзе дасюль моцны рух г. зв. «выгнаных» (немцаў, дэпартаваных з Польшчы і Чэхаславакіі ў 1945 годзе, а таксама іх нашчадкаў). Яго лідэры прызналі мужнасць чэхаў, якія дапусцілі дэманстрацыю фільма, і заклікалі паказаць стужку ў ФРГ.

**Па матэрыялах «Junge Freiheit» (Германія)**

ЦІКАВА



# ВЯРТАННЕ РОБІНА ГУДА

Іван БІЧ

**З нагоды сусветнай прэм'еры фільма «Робін Гуд» (рэжысёр Рыдлі Скот) культуролагі ва ўсім свеце спрачаюцца, чаму вобраз разбойніка з Шэрвудскага лесу так запатрабаваны ў сучасным грамадстве.**

Калі верыць папулярнай інтэрнэт-энцыклапедыі Wikipedia, кінематаграфісты рэгулярна звярталіся да гэтага сюжэта. Першая стужка выйшла ў далёкім 1908 годзе, а «Робін Гуд» рэжысёра Рыдлі Скота стане 51-й экранізацыяй легенды пра славутага разбойніка. Прычым гэта без уліку карцін, знятых не ў англамоўных краінах, мультфільмаў, коміксаў, кніг, гульняў, у тым ліку камп'ютарных, канструктараў Lego і г.д. У дадатак яшчэ ў 1860 годзе ў Лондане адбылася прэм'ера аднайменнай оперы.

Самае цікавае, што фабула ўсіх фільмаў і твораў вядомая гледачу з самага пачатку. Ёсць канон, пабудаваны на раманах Вальтэра Скота, які перапрацаваў балады, запісаныя прыкладна ў XIV стагоддзі, што пазней былі апрацаваныя і выданыя ў 1795 годзе літаратарам Джозэфам Рытсанам.

Адпаведна версіі Вальтэра Скота, прыкладна ў XII стагоддзі ў Шэрвудскім лесе, што пад Нотынгемам, дзейнічае шайка Робіна Гуда. Банда заўзята змагаецца з мясцовым шэрыфам. Адначасова групоўка Робіна дапамагае каралю Рычарду Львінае Сэрца вярнуць сабе трон, які незаконна захапіў прынц Джон. Побач з Робінам прысутнічае традыцыйны набор персанажаў: брат Тук, маленькі Джон і ягоная жонка Мэрыён. У фінале кожнага фільма паўстанцы перамагаюць каварнага праціўніка. Надыходзіць доўгачаканы хэпі-энд.

З 1908 года ў гісторыі пра Робіна Гуда мала што змянілася. Хіба што ў апошні час сцэнарысты ўвялі ў склад герояў чарнаскурага або араба, прысутнасць якога на экране павінна сведчыць пра расавую талерантнасць Робіна і яго кампаніі. Таксама з'явіліся гомасексуальныя версіі прыгод Робіна. У фільме «Robin of Sherwood» Робін і шэрыф — тайныя каханкі, а Мэрыён ім толькі замінае. З іншага боку, палітычная кан'юнктура заўсёды ўплывала на трактоўку героя. У 1930-я гады, у пік папулярнасці ідэй марксізму, у адным з фільмаў пра Робіна Гуда той называў лясных братоў «таварышы».

Між тым, большасць гісторыкаў схіляюцца да таго, што Робіна Гуда як канкрэтнай фігуры ніколі не існавала. Імя Робін Гуд у Сярэднявеччы было сінонімам слова «злачынец». Магчыма, таму, што слова «гуд» перакладаецца з англійскай як «каптур» — частка касцюма ўсіх людзей з вялікай дарогі. У той жа час была папулярная прымаўка «Hood not so good» (каптур — гэта не добра).

Прыкладна з 1600 года зафіксаваны феномен, калі шматлікія ананімныя злачынцы называлі сябе Робін Гуд. Так іх называлі брытанскія ўлады Гая Фокса (чалавека, які спрабаваў падпаліць будынак брытанскага парламента).

Калі ніякага Робіна Гуда не было, а ўсе фільмы зробленыя па аднаму клішэ, лагічна ўзнікае пытанне: што прымушае людзей у наш час зноў і зноў хадзіць у кіно і сачыць за прыгодамі злодзея?

Пачнём з таго, што любоў да старажытных бандытаў кшталту Робіна Гуда прывітая нам яшчэ ў дзяцінстве. Вядомы гісторык Эрык Хобсбаум яшчэ ў 1969 годзе пісаў пра тое, што ў традыцыйным сялянскім грамадстве бандытызм — праява парадыгмы сацыяльнага пратэсту. Як доказ ён прыводзіць тэксты народнай літаратурнай творчасці (песні, казкі), у якіх бандыты выглядаюць народнымі героямі.

На самай справе, як прызнае той жа Хобсбаум, старажытны бандытызм быў далёкі ад рамантыкі. Гісторык даказвае, што ў падполле людзей кшталту Робіна Гуда прыводзілі не высокія тэорыі, а асабістая помста. Этыка бандытаў была далёкая ад прынцыпаў гуманізму.

Аднак што нам да гістарычнай праўды: пачуція ў дзяцінстве казкі пра магчымасць імклівага пакарання зла і аднаўлення справядлівасці застаюцца з намі на ўсё жыццё. У сваёй кнізе «Robin Hood: A Mythic Biography» («Робін Гуд: біяграфія міфу») гісторык Стывен Найт адзначае: «Перыядычны рэнесанс папулярнасці Робіна Гуда адлюстроўвае сацыяльна-псіхічны стан сучаснага заходняга грамадства».

Па Найту, калі грамадзяне адчуваюць сябе сацыяльна пакрыўджанымі, не вераць у прававу і выбарчую сістэму, у іх фармуецца запатанне на адпаведную пратэстную культурную прадукцыю. Такія комплексы лепш за ўсё кампенсуюць пабачаныя ў кінатэатры сцэны пра прыгоды славутага разбойніка.

Менавіта так гісторык тлумачыць апошні выбух цікавасці да Робіна Гуда ў 1980-я, калі Маргарэт Тэтчэр і Рональд Рэйган праводзілі ліберальныя эканамічныя рэформы. За той перыяд выйшла аж восем экранізацый легенды.

Гісторыя працягваецца. Яшчэ калі рэцэсія толькі пачалася, брытанскія лейбарысты назвалі адзін з праектаў сваіх фіскальных законаў, які абкладаў падаткам багатых, Robin Hood Tax (Падатак Робіна Гуда).

Выхад на экраны чарговага фільма пра Робіна Гуда, безумоўна, цудоўна пасуе цяперашнім настроям часоў глабальнага эканамічнага крызісу.

Між тым, як пішуць палітолагі, гуляць з вобразам Робіна Гуда небяспечна. Хаця Галівуд арыентуецца на кінарынак ЗША і Еўропы, ягоную прадукцыю глядзяць ва ўсім свеце. І калі для еўрапейца або амерыканца фільм пра Робіна Гуда папросту псіхічная кампенсацыя эканамічных праблем, для жыхароў Трэцяга свету Робін Гуд — прыклад для паводзінаў.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# КАДАФІ РАЗГАВАРЫЎСЯ

Алег НОВІКАЎ



**Адзін з самых вялікіх арыгіналаў ад палітыкі правадыр лівійскай рэвалюцыі Муамар Кадафі рэдка дае інтэрв'ю. Але на мінулым тыдні ён падзяліўся з журналістам нямецкага часопіса «Spiegel» сваімі думкамі наконт асноўных праблем сучаснасці. Вось галоўныя тэзісы ягонай прамовы.**

***Чаму Швейцарыя павінна быць ліквідаваная***

— Швейцарыя — гэта адна вялікая мафія. Спачатку яны былі добрым народам. Мы ўсе цэнім швейцарскія гадзіннікі. Аднак пасля Швейцарыя пачала рабіць нам праблемы. Згадаем хаця б гісторыю з забаронай мінарэтаў або публікацыю карыкатур з выявай прарока. Даўно надышоў час пакласці ўсяму гэтаму канец. ...Швейцарыя стаіць па той бок чалавечай супольнасці. Не падпарадкоўваецца ніводнаму правілу Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Толькі ў 2004 годзе Швейцарыя ўступіла ў ААН, аднак да гэтага яе там не было. Не падпарадкоўваецца ніводнаму правілу Еўрапейскага саюза. Яны хочуць стаяць над міжнародным правам. Менавіта таму гэта нацыя ператварылася ў мафію.

***Як швейцарцы рабуюць укладчыкаў банкаў***

— У Швейцарыю едуць усе, хто абрабаваў банк, каб пакласці там грошы на сакрэтны рахунак. Пасля шмат уладальнікаў такіх рахункаў пры таямнічых умовах забіваюць. Гэта праца Швейцарыі. Пра гэта сведчаць вынікі следства. Пры гэтым усё падаецца як суіцыд. Швейцарцы кажуць, што нябожчык добраахвотна пайшоў з жыцця. Аднак на самой справе яго забілі з-за грошай. Такім спосабам ужо забіта каля 7 тысяч чалавек. Таму ж і заклікаю да ліквідацыі гэтай дзяржавы. Франкамоўная частка павінна адыйсці да Францыі, нямецкамоўная — да Германіі, італьянскамоўная — да Італіі. Дарэчы, намеснік Бен Ладэна жыве зараз у Швейцарыі. Швейцарыя фінансуе тэрарызм.

***Пра арышт сына Ганібала ў Швейцарыі***

(Ганібал Кадафі быў арыштаваны за тое, што разам з жонкай збіў двух парт'е ў гатэлю).

— Нічога падобнага ўвогуле не было. У першы раз чую пра тое, што Ганібал кагосьці біў. Швейцарцы, натуральна, радуюцца гэтаму інцыдэнту. Гэта банда, якая ўвогуле не карыстаецца прававой сістэмай. Пра гэта сведчыць тое, як яны паводзілі сябе з Ганібалам. Паліцэйскія паводзілі сябе быццам злачынцы. Выламалі дзверы, надзелі на сына кайданкі, жонку адвезлі ў шпіталь, а дачку, якая мае ўсяго два гады, пакінулі адну ў гатэлі. Пасля пасадзілі Ганібала на халодны асфальт. Менавіта так паводзіць сябе Аль Каіда. Гэта быў акт тэрарызму.

***Пра тое, што нашчадкам будзе сын Саіф Іслам***

— Я не кароль. Не патрэбны мяне нашчадак на троне. У Лівіі кіруе народ. Саіф у стане і ва ўзросту, калі можа сам паклапаціцца пра сябе. Ён мае адукацыю, ведае мовы.

***Пра еўрапейскіх палітыкаў***

— Маім самым блізкім сябрам у Еўропе ёсць Сільвія Берлусконі. Ангела Меркель — гэта хутчэй мужчына, чым жанчына. Хаця я з ёй ніколі асабіста не размаўляў.

***Як пакласці канец нелегальнай эміграцыі***

— Еўрапейскі саюз павінен плаціць Лівіі штогод 5 мільярдаў еўра на барацьбу з эмігрантамі. Мы распрацавалі добры план рашэння гэтай праблемы. Пачнём будаваць і развіваць у афрыканскіх краях, адкуль бягуць людзі, праекты і даваць людзям працу. Тое самае зробім для тых эмігрантаў, якія знаходзяцца ў Лівіі. Будуць мець дзе жыць і адмовяцца ад ідэі ехаць у Еўропу. Акрамя таго, можна будзе ўзмацніць наземную мяжу з дапамогай радараў і спецыяльных цягнікоў.

***Пра справу балгарскіх урачоў***

(Балгарскіх урачоў 8 гадоў па выніках сфальсіфікаванага следства і прадузятага суда трымалі за кратамі па абвінавачанню ў заражэнні лівійскіх дзяцей вірусам СНІД).

— Следства паказала, што існаваў ліст з прозвішчамі лівійскіх дзяцей, якіх планавалася забіць.

***Пра Барака Абаму***

— Калі кажам пра паразу ўсходняй палітыкі Абамы, ён тут не пры чым. Абама — гэта вынік шматлікіх амерыканскіх крызісаў. Абама не зрабіў ніякай памылкі. Наадварот, заслугоўвае лепшых ацэнак за сваю рэформу сістэмы здароўя і абяцанне вывесці войскі з Ірака і Афганістана, за ідэю скарачэння ядзерных арсеналаў».

***Пра Іран і яго прэзідэнта***

— Махмуд Ахмадзінеджад мае моцную волю, ён рэвалюцыянер, аднак пры гэтым не агрэсіўны чалавек. Ён паважае закон і права. Калі Абама хоча пакончыць з атамнай праграмай Ірану, трэба спачатку ўзяць пад кантроль Ізраіль, ліквідаваць ягоную зброю масавага знішчэння і тады ягоная палітыка будзе мець поспех ва ўсім рэгіёне, у тым ліку ў Іране. Не думаю, што Іран хоча знішчыць Ізраіль. Мяркую, ён папросту думае пра больш дэмакратычную дзяржаву на месцы цяперашняга Ізраілю, на палесцінскай зямлі. Ніхто не прапануе выкінуць яўрэяў у мора.

***Адкуль ён бярэ інфармацыю?***

— Большасць інфармацыі я бяру з інтэрнэту. Кожную раніцу доўга сяджу перад кампутарам.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### УГА ЧАВЕС



Лідэр балівarскай рэвалюцыі становіцца, падобна, сакральнай асобай. Прынамсі, як і ў выпадку з карыкатурамі на Мухамеда, газеты пачынаюць баяцца публікаваць малюнкі, на якіх ёсць Уга. Першы прэцэдэнт меў месца на мінулым тыдні, калі арганізатары выставы «Гісторыя Калумбіі ў карыкатурах» адмовілі мастаку Мігелю Кардэнасу ў праве размяшчаць на стэндах выставы свае працы. Увогуле, гаворка выключна пра адну працу, на якой выяўлены старыя сябры — Уга Чавес і галоўны камандзір левай радыкальнай групоўцы FARC. На малюнку падобны да Чавеса персанаж выступае за тое, каб разглядаць партызанскія зоны FARC як частку Венесуэлы. Карыкатура высмейвае кантакты FARC і венесуэльскай улады, пра якія вядома ўсім. Відавочна, з'яўленне на выставе такой карыкатуры магло выклікаць адмоўную рэакцыю ў Каракаса. Таму арганізатары вырашылі не рызыкаваць і забаранілі згаданаму мастаку ўдзельнічаць у выставе. Каб не выставіць сябе праціўнікамі дэмакратыі, арганізатары заявілі, што яго карыкатуры нехта выкраў. Мастак лічыць, што мела месца дыскрымінацыя.

### НУРСУЛТАН НАЗАРБАЕЎ



Прэзідэнт Казахстана 12 мая атрымаў ад дэпутатаў парламента статус Лідэра нацыі (каз. «елбасы»). Новы тытул значна пашырае паўнамоцтвы Назарбаева і адказнасць за хоць нейкую крытыку на ягоны адрас. У крымінальны кодэкс Казахстана ўведзеная адказнасць за новы від злачынства — «перашкода дзейнасці Нурсултана Назарбаева». Яна карае за апаганьванне яго вываў, скажэнне яго біяграфіі, публічную абразу і «іншы замах на ягоны гонар». Гэтыя злачынствы, дарэчы, вырашана лічыць не менш небяспечнымі, чым акты тэрарызму, хаця максімальны турэмны тэрмін за парушэнне артыкула пра «перашкоду дзейнасці» цягне на 3 гады турмы. Такая сістэма прававой бяспекі цалкам лагічная, калі згадаць унікальныя якасці асобы Назарбаева. Іх падрабязна пералічылі дэпутаты перад тым, як галасаваць. Напрыклад, адзін з дэпутатаў заявіў, што Нурсултан мае здольнасць бачыць ход гісторыі, другі параўнаў працы Назарбаева з працамі Тэдора Рузвельта і Дэн Сяопіна і г.д. Застаецца дадаць, што ў народзе наданне Назабаеву тытула лідэр нацыі мела цікавую рэакцыю. З'явілася папулярная прымаўка: «Елбасы, елбасы, дай народу кілбасы».

### РУСТАМ МІНІХАНАЎ

Новаму прэзідэнту Татарстана трэба адказаць на незвычайнае пытанне — як называецца насельніцтва краю, якім ён кіруе. Хутка ў Расіі перапіс насельніцтва, і кожнаму жыхару РФ трэба будзе пазначыць сваю нацыянальнасць. Раней усе ў Татарстане лічылі сябе татарамі. Аднак у апошнія гады ўзмацніўся рух булгар. Галоўная іх мэта — вярнуць роднаму краю «гістарычную назву» і адмовіцца ад «навязанага бальшавікамі ў 1920-я гады этноніма «татары». Новая назва быццам пазбавіць людзей комплексу, звязанага са словам «татары». Булгарскі рух існаваў і раней, аднак быў вельмі маргінальным. Таму заклікі называць татараў булгарамі той жа Шаймііеў лічыў спробай раскалоць нацыю. Цяпер булгары сталі амаль істэблішментам. Нядаўна грамада татараў у Арэнбургу прапанавала Казані перайменаваць Татарстан у Булгарыю. На гэты раз афіцыйныя ўлады і нават Шаймііеў, былы прэзідэнт Татарстана, намагаюцца ў дыскусію не ўмешвацца. Тыя, хто лічыць сябе татарамі, між тым, вінавацяць булгар у палітычнай правакацыі, быццам яны пайшлі на змову з федэральным Цэнтрам, для якога, маўляў, галоўнае — паменшыць удзельную вагу татараў у насельніцтве Расіі. Застаецца сказаць, што ў спісе федэральнай службы статыстыкі прысутнічаюць 140 варыянтаў татарскіх этнонімаў. У тым ліку такія экзатычныя, як сувары, бігеры, міжэры.



ІМПРЭЗА

# ЦІ ЁСЦЬ ГНОМЫ Ў ІРАНЕ?

## ДНІ КУЛЬТУРЫ ШВЕЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ: ЛІТАРАТУРА

Алесь ГІНЗБУРГ

**13–15 мая пад эгідай Пасольства Каралеўства Швецыя і Шведскага інстытута, у рамках Дзён культуры Швецыі ў Беларусі прайшлі традыцыйныя шведска-беларускія літаратурныя чытанні. Літаратары дзвюх краін сустрэліся для выступу ў Мінску, каб потым выправіцца ў вандроўку па Палессі.**



Дні паэзіі ў Пінску 15 мая. Паэт Андрэй Хадановіч, музыка Сяргей Пукст

Наведаўшы Слуцк, інтэрнацыянальная літаратурная брыгада прэзентавала свае творы ў Дзіцячай раённай бібліятэцы Салігорска і ў Палескім дзяржаўным універсітэце ў Пінску. Беларускую літаратуру ў межах чытанняў прадстаўлялі пісьменнікі Барыс Пятровіч і Анка Упала, філосаф і эсэіст Валянцін Акудовіч, паэты Марыя Мартысевіч, Віталь Рыжкоў, Дзмітры Плакс, Андрэй Хадановіч.

Што да шведскай каманды, то сёлета яна выглядала надзвычайна: яе разынкай стаў інтэрнацыяналізм шведскамоўных пісьменнікаў. Апроч сусветна вядомай паэткі, драматурга, прафесаркі літаратуразнаўства Агнеты Плэель, у яе ўвайшлі фінская шведка, перакладчыца фінскай і рускай літаратуры Яніна Арлоў, іранска-шведская пісьменніца Азар Махлуджан і польска-шведскі пісьменнік і журналіст Мацей Зарэмба. Падчас чытанняў ім дапамагалі: музычным суправаджэннем Сяргей Пукст і акторскім чытаннем — Алена Іваннікава.

Публіцыстычны акцэнт праграмы, прапанаванай аматарам мастацкай літаратуры, не мог не кідацца ў вочы, але менавіта ён прыцягнуў увагу карэспандэнта «НЧ». Іранка Азар і паляк Мацей пакінулі родныя краіны па палітычных прычынах. Тое, што яны прэзентуюць шведскаму (а цяпер і беларускаму) чытачу, — можна акрэсліць як «нон-фікшн» напрамак, які ўпэўнена набірае папулярнасць ва ўсім свеце. За такой прозай стаяць рэальныя, часта трагічныя падзеі, лёс чалавека, і таму яна мае не толькі эстэтычную, але і дакументальную каштоўнасць.

Апроч таго, гэтыя аўтары закранаюць іншую праблему: феномен пісьменнікаў з падвойнай ідэнтычнасцю, праблемы эмігрантаў у Заходняй Еўропе.

Такім чынам, прапануем вашай увазе творчыя візіткі двух самых незвычайных удзельнікаў шведска-беларускіх чытанняў.

### «Ніхто не павінен паліць кнігі»

З усіх аўтараў шведска-беларускіх чытанняў Азар Махлуджан найбольш паразумелася з паэтам-слэмерам Віталём Рыжковым:

*...дабро робіцца злом пасьля*
*перамогі над злом*
*аўтаматычна; параза дабра*
*— перамога.*
*а праўда — гэта сумленьне,*
*сцягнутае вузлом*
*на шыі нямога.*

«Гэта мой выпадак», — гаворыць яна, калі ёй перакладаюць гэтыя радкі з «Чорна-белага верша». «Я працавала ва Універсітэцкай бібліятэцы Тэгерана, і мы з калегамі, як і ўся творчая інтэлігенцыя, пратэставалі супраць шаха Махамеда. Нарэшце мы дамагліся свайго: у 1979 годзе шах быў зрынуты, а да ўлады прыйшоў Хамейні. І мы атрымалі новую дыктатуру, гэтым разам — рэлігійную».


Азар Махлуджан нарадзілася ў Іране ў 1949 годзе. Бібліятэкар па адукацыі. У 1982 годзе атрымала палітычны прытулак у Швецыі

Бібліятэкары, перакананая Азар, — гэта не проста каталагізатары кніг. Яны павінны рупіцца пра пісьменства, свабоду слова, асвету, змагацца супраць цэнзуры. Новыя ўлады загадалі бібліятэкам знішчыць кнігі шаха Махамеда, працы Маркса і Леніна, а таксама ўсе падручнікі па дарвінізму. Прафсаюз бібліятэкараў, актывісткай якога была Азар, напісаў ліст пратэсту: што б ні было ў кнігах, ніхто не павінен іх паліць. Неўзабаве жанчыну прыйшлі арыштоўваць. Яна здолела схавацца ад уладаў, але калі хавацца стала небяспечна, яна вырашыла пакінуць Іран праз Турцыю, з кантрабандыстамі (такі спосаб перапраўкі людзей на Захад апісваў яшчэ Сяргей Пясецкі ў «Каханку Вялікай Мядзведзіцы»).

Поўная небяспекі выправа скончылася для Азар паспяхова — яна атрымала палітычны прытулак у Швецыі. А неўзабаве дазналася, што яе сваяк, які спрабаваў пакінуць радзіму тым жа шляхам, замерз падчас уцёкаў. «Я адчувала тое ж, што і былыя вязні канцлагераў. Чаму яны загінулі, а я — жыву?» Такім чынам яна вырашыла напісаць сваю першую кнігу — «Разарваныя карцінкі», дзе апісала ўсё перажытае падчас пераследу ў Іране і ўцёкаў, а таксама досвед быцця эмігрантам з трэцяга свету ў Еўропе. Пісала адразу па-шведску, з дапамогай сваёй выкладчыцы шведскай мовы.

На сёння Азар Махлуджан аўтарка чатырох кніг прозы.


Мацей Зарэмба (Зарэмба-Бяляўскі), журналіст і пісьменнік, нарадзіўся ў 1951 годзе ў Познані, Польшча. Эміграваў у Швецыю ў 1969 годзе

Таксама яна плённа перакладае літаратуру з мовы фарсі на шведскую.

### «Гномы сапраўды існуюць»

«У Беларусі я пачуваюся, нібы вярнуўся дадому», — прызнаваўся Мацей Зарэмба. Сям'я яго бацькі да 1939 года жыла ў Белева, што каля Маладзечна. Яго дзядзька Эдвін некаторы час быў мэрам

---

### Азар Махлуджан

#### З кнігі «Разарваныя выявы»

Як холадна! Усё цела зацякло. Нічога не адчуваю. Адзін з мужчынаў пад'язджае і кажа, што я сяджу на шыі каня і мушу пасунуцца назад, да чалавека, які сядзіць за мною. Але я не магу паварушыцца. Ногі як бярвёны. Здранцвелі. Я бяру нагу рукамі ды спрабую пасунуць яе назад. Праваднік кажа: трэба рухацца, каб не замерзнуць, трэба варушыць пальцамі ног, увесь час.

Урэшце мы пад'язджаем да пячоры, спешваемся. Адзін з мужчынаў пайшоў перад намі і пачаў раскладваць вогнішча. Нам трэба трохі сагрэцца. Праваднік, галоўны кантрабандыст, доўга глядзіць на мае боты. Я пачынаю хвалявацца. Чаму ў яго такі позірк? Ён што, здагадаўся, што я схавала там усе свае грошы? Можа, ён ведае, што пераважная большасць уцекачоў робяць менавіта так? Тады, магчыма, ён папросту хоча адабраць мае грошы. Перад уцёкамі мы чулі шмат гісторый пра тое, што здараецца з іншымі, хто збягае.

Ён паказвае на мяне і нешта кажа сваім людзям. Адзін з іх выходзіць з пячоры і вяртаецца з парай тоўстых шкарпэтак, працягвае іх мне. Яны лічаць, што мае боты недастаткова цёплыя. Я кажу, што на мне шмат вопраткі, і гэтага досыць. Але праваднік настойвае, кажа, што мы, гарадскія, нічога не ведаем пра холад. Ён хоча, каб я пераабулася, кажа: «Ты не разумееш, але людзі гінуць у такую сцюжу. Я адказваю за вашае жыццё».

Я не ведаю, што рабіць, але хутка прымаю рашэнне. Я кажу, што хачу пагутарыць з ім сам-насам. Астатнія выходзяць вонкі. Я кажу яму, што мушу даверыць яму сакрэт, бо мне патрэбная дапамога. Я распавядаю пра схаваныя ў ботах грошы. Ён разумее, чаму я не хачу пераабувацца, усміхаецца прыязна і кажа, што не згубіць мае боты, пакладзе іх ва ўласную седлавую торбу.

Я аддаю яму боты, нацягваю тоўстыя шкарпэткі на тыя дзве пары, што ўжо маю на нагах, абуваюся ў мужчынскія чаравікі. Потым выходжу і саджуся на свайго каня, бачу, як ён кладзе боты ў седлавую торбу. Мае спадарожнікі пытаюцца ў мяне пра боты. У нашым сховішчы ў Тэгеране мы ўсю ноч перад ад'ездам працавалі, каб схаваць свае грошы ў абутку. Гадзінамі ўклейвалі тонкія паперкі ў падэшвы, так што знайсці іх магчыма было толькі разрэзаўшы нашыя чаравікі і боты.

Людзі, што ўцякаюць разам са мною, насядаюць на мяне, кажуць, што мне не трэба было гаварыць праўду кантрабандысту, я рызыкую ўсім, што ў мяне ёсць. Я мушу рэзка адказаць ім, абарваць. Я кажу, што дыскусія скончаная, я ведаю, што раблю. Але насамрэч я хвалююся — калі мае боты застануцца ў яго, я прапала. Што рабіць адзінокай жанчыне па той бок мяжы, калі ў яе няма грошай? Куды ісці? Можа, я ўсё ж здуравала, адкрыўшы свой сакрэт?..

**Пераклаў са шведскай Дзмітры Плакс**

## Мацей Зарэмба

### З эсэ «Чаму я стаў рэпарцёрам»

Найвялікшая гістарычная перамена нашага часу — распад Савецкага Саюза і канец халоднай вайны — была сюрпрызам для ўсяго свету, у роўнай ступені і для шпіёнскіх цэнтраў, і для рэдакцый сродкаў масавай інфармацыі. І ўсё роўна гэта не было нейкім раптоўным землятрусам. Гэта быў вынік доўгага працэсу, які толькі час ад часу прымаў форму нечаканых падзеяў. Драматургія гэтага працэсу складалася з незаўважных пасоўванняў у грунтоўным выбары, пераменаў у тоне, гульні мімікі, слоўжывання. Маленькія, паўзучыя навіны, зробленыя не для газетных урэзак.

Заходнім СМІ было цяжка зачапіць гэтае «праграмнае забеспячэнне». У аснoўным з нязвычкі тлумачыць сімвалы ды іншыя чалавечыя тонкасці. Нібыта нашы грамадствы сапраўды сталі такімі празрыстымі і літаральнымі, як нам абяцалі інжынеры. (…) Але па-за жалезнай заслонай камунікацыя ў значнай ступені па-ранейшаму складалася з намёкаў і грымасаў. Вялікія перамены ўжо пачыналіся, але вонкі яны былі бачныя толькі як маленькія знакі.

Калі паглядзець на падзеі такім чынам, дык, напрыклад, тое, што здарылася ў Вроцлаве 6 лістапада 1987 года, павінна было з'явіцца ў рапартах тэлеграфных агенцтваў. У гэты дзень на цэнтральную плошчу выйшлі студэнты, каб цалкам у адпаведнасці з пратаколам адзначыць памятны дзень рускай рэвалюцыі праз дэманстрацыю сваёй любові да Леніна і веры ў Савецкі Саюз. «Чырвоная армія — твой сябар дзяцінства!» — скандзіравалі маладзёны, нявінна ўсміхаліся і махалі чырвонымі сцягамі. І адразу — да поўнага захаплення і задавальнення гледачоў — былі арыштаваныя паліцыяй, якая не сумнявалася, што тут справа нячыстая. Магчыма, упершыню ў гісторыі Імперыі дэспатызм сам пацвердзіў, што ўжо ніхто больш не верыць у лозунгі (…).

Мая ўлюбёная гісторыя таксама адбылася ў той час, і аўтарам падзеі была тая самая хэпенінг-група з Вроцлава. Яны называлі сябе «Аранжавая альтэрнатыва», збіраліся пад лозунгам «Гномы сапраўды існуюць!» і сістэматычна бянтэжылі вартавых парадку мірнымі жартамі і розыгрышамі. Ніжэй — запіс, зроблены ў 1987-м годзе. Штаб паліцэйскіх сілаў па барацьбе з беспарадкамі камунікуе з групай спецыяльнага прызначэння на месцы падзей:

— Хто там такія?
— Гномы.
— Якія гномы?
— Звычайныя гномы.
— Вы што там, звар'яцелі?
— Не. Тут гномы на вуліцы, мы іх бярэм.
— Слухай, вы што там напіліся?
— Не, мы не пілі.
— Але бачыце гномаў на вуліцы?
— Так, ну, гэта студэнты, апранутыя гномамі.
— А, студэнты (з палёгкай у голасе)... і што яны робяць, гномы гэтыя?
— Спяваюць.
— Што спяваюць? (Зноў занепакоены голас.)
— «Мы — гномы», — вось што.
— Ну, тады можаце іх браць.

Гномаў было дзесяць тысяч. Ці я памыляюся, калі бачу хуткі скон Імперыі ў другім адказе камандзіра паліцэйскай спецгрупы: «Звычайныя гномы»?

Мы — тыя, хто пісаў у гэты час пра тое няроўнае супрацьстаянне, — лічылі колькасць страйкаў у Польшчы і савецкіх дывізіяў за яе мяжою. Пераважная большасць з нас не мела ані фантазіі, ані слыху, каб пачуць інтанацыю, ці зразумець ролю гномаў у гісторыі. Але жыхары Вроцлава мелі і тое, і другое, і яны пасля падзення Берлінскай сцяны паставілі помнік гному на парадным праменадзе свайго гораду. Паедзьце і пагляздзіце самі.

Ці ёсць гномы ў Іране? Як іх завуць? Магчыма, гэта такая ж важная інфармацыя, як і звесткі пра ядзерную праграму. Калі здранцвелы парадак растрэскваецца, гэта адбываецца перш за ўсё сярод маленькіх людзей, якія карыстаюцца маленькімі словамі, што не знаходзяць месца ў газетнай урэзцы.

**Пераклаў са шведскай Дзмітры Плакс**

мястэчка. Яго дзед нарадзіўся ў Гомелі, працаваў кандуктарам на Транссібе. Таму для Мацея яго першы прыезд у Беларусь — гэта яшчэ і спроба сягнуць сваіх каранёў. «Я заходжу ў крамы і прыглядаюся да людзей: а раптам у кагосьці такія ж, як у мяне, рысы твару?»

Пасля высялення ў Польшчу Бляўскія аселі ў Познані. Там і нарадзіўся Мацей, «яры антысаветчык», як ён сам сябе рэкамендуе. У дзяцінстве ён сабатаваў вывучэнне рускай мовы, якую прымушалі вучыць у школе, пра што цяпер нават шкадуе. Рашэнне выехаць на Захад у 1969 годзе было звязанае з непрыняццем камуністычнай ідэалогіі.

З 1989 года Мацей Зарэмба з'яўляецца супрацоўнікам аддзела культуры шведскай газеты «Dagens Nyheter». Яго артыкулы, прысвечаныя рознага кшталту парушэнням, выклікалі шырокі рэзананс у Швецыі і Польшчы.

«Я расказаў вам пра сваіх крэўных продкаў з Беларусі, але ёсць у мяне і яшчэ адзін продак адсюль — духоўны. Гэта ваш зямляк, польскі пісьменнік Рышард Капусцінскі», — гаворыць Мацей публіцы ў Пінску. Як і Капусцінскі, 100-гадовы юбілей якога сёлета адзначаецца і ў Беларусі, Зарэмба праславіўся сваімі літаратурнымі рэпартажамі.

## Новыя шведскія кнігі па-беларуску

Плён Дзён культуры Швецыі — гэта папулярныя ва ўсім свеце кнігі, якія пачалі выходзіць сёлета ў Беларусі. На мінулым тыдні ў рамках шведскіх мерапрыемстваў адбыліся прэзентацыі дзіцячай літаратуры:

Юя і Томас Віслaндэр **«Малы і Мядзведзік»** (РВУ «Літаратура і Мастацтва», пераклад Надзеі Кандрусевіч) — адна з самых любімых шведамі дзіцячых кніг.

Тувэ Янсан **«Маленькія тролі і вялікая паводка»** (выдавец Зміцер Колас, пераклад Насты Лабады) — першая кніга з вялікай серыі кніг пра знакамітых мумі-троляў, выдадзеная з ілюстрацыямі аўтаркі.

Апроч таго, шукайце ў кнігарнях шыкоўную кнігу **«Папулярная музыка з Вітулы»** Мікаэля Ніемі (выдавецтва «Логвінаў», пераклад Вольгі Цвіркі) — сусветна папулярны шведскі раман, аўтар якога быў удзельнікам шведска-беларускіх чытанняў у мінулым годзе.

Яшчэ адна шведска-беларуская кніжная падзея наперадзе.

**1 чэрвеня а 16:00** нас чакае прэзентацыя манаграфіі **«У цені Польшчы і Расеі. Вялікае Княства Літоўскае і Швецыя ў часе эўрапейскага крызісу сярэдзіны XVII ст.» Андрэя Катлярчука.** Прэзентацыя кнігі адбудзецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (пр-т Незалежнасці, 116), у галерэі «Лабірынт» (трэці паверх).

З НАГОДЫ

# ЭПОХА БАРАДУЛІНА

Пётр РАЗУМОВІЧ

**«Ён сагрэў мне сэрца», — так пра дакументальны фільм «Эпоха Барадуліна» ў гутарцы з прэс-службаю «Белсату» сказаў яго герой. Упершыню стужку паказалі на «Белсаце» ў гонар 75-гадовага юбілею Рыгора Барадуліна ў сакавіку. Нядаўна паказ стужкі адбыўся ў мінскай галерэі «Ў». 30 мая фільм «Эпоха Барадуліна» — зноў на «Белсаце».**



Стваральнікамі дакументальнага фільму стала сямейная пара: рэжысёр і аўтар сцэнарыя — Віктар Корзун, прадзюсер ды інтэрв'юер — Кася Камоцкая.

«Мы шмат што здымаем, фіксуем для гісторыі, каб цікавае і важнае не знікла. Рыгора Барадуліна фільмавалі з 2007 года. Была магчымасць бачыць і гаварыць з ім у прыватных сітуацыях, у інтымным антуражы. Грэх было не скарыстацца», — кажа Віктар Корзун. Аўтары фільма дзякуюць за гэта барду Алесю Камоцкаму, які мае багата песень на вершы Барадуліна і сябруе з ім. «Атрымаўся багаты архіў. Было спадзяванне аформіць у фільм, юбілей стаў добрай нагодай», — распавядае рэжысёр.

Дарэчы, творчы тандэм можа наладзіць цэлы цыкл: «Шмат зняты па персаналіях — тыя самыя Васіль Сёмуха, айцец Надсан, Сяржук Вітушка…»

Кася Камоцкая кажа, што матэрыялу пра Барадуліна хопіць яшчэ на два фільмы. Бо вартая асоба… Барадулін — адзін з самых лепшых беларускіх паэтаў. Шмат хто, упэўненыя аўтары стужкі, скажуць, што і найлепшы.

Застаецца толькі шкадаваць, што Аляксандр Лукашэнка, віншуючы з юбілеямі расійскіх поп-музыкаў, на 75-годдзе класіка беларускай літаратуры Барадуліна забыўся.

У фільме багата архіўных кадраў — і відэа, і фота. Датычаць яны не толькі жыцця паэта, але і эпохі, у якую яму давялося жыць. То бок з 1935 года і да сённяшняга дня. Усё гэта паказваецца пад акампанемент вершаў Барадуліна з ягонымі каментарамі-згадкамі, развагамі пра малое і вялікае.





І будзем спадзявацца, што гэты фільм можа працягнуцца хронікаю не аднаго года і новых барадулінскіх радкоў. І што нагодай для чарговага паказу фільму праз нейкі час будзе атрыманне Рыгорам Іванавічам Нобелеўскай прэміі.

«Самыя ўдалыя, пранікнёныя эпізоды стужкі — гэта калі гучаць вершы нібыта ад імя маці Барадуліна, пасляваенныя, са зваротам да мужа Івана, якога ўжо няма. Удала легла песня Камоцкага на кадры паваеннага часу. З Караткевічам, Быкавым… Ва Ушачах, калі Барадулін стасуецца з суседзямі, нешта робіць. Кранальныя моманты, калі Барадулін каментуе архіўныя кадры», — згадвае аўтар і рэжысёр фільму.

Такіх кранальных момантаў шмат — кожны глядач нечым прасякнецца. Скажам, успамінамі Барадуліна: калі прыйшлі фашысты, ён сядзеў маляваў хатку, а немец падышоў і падмаляваў дым з коміну. А потым быў ужо дым ад пажараў над хатамі, згадвае паэт.

Ці такі метафарычны момант: малым Барадулін зрабіў шпакоўню, прымацаваў да дрэва, і вось цяпер можна бачыць, як вырасла гэтае дрэва — шпакоўня ўжо высока-высока.

Рыгор Барадулін адзначае, што фільм зняты нетрадыцыйна: «Я сам маю досвед стварэння дакументальных фільмаў. Але звычайна ўсё робіцца па адной схеме. А тут нібы фільм у фільме. І яшчэ мне спадабалася, што там не толькі пра мяне, пра мяне, пра мяне… Там і Быкаў, і Караткевіч. Акцэнты расстаўленыя шырока, усплываюць такія постаці».

Што да згаданых сяброў-літаратараў Барадуліна, то ў фільме ёсць кадры, як Караткевіч выступае на з'ездзе пісьменнікаў, што кажа пра Барадуліна Быкаў і як сам паэт нясе крыж на пахаванні Васіля Уладзіміравіча.

Трапіў у кадр і Аляксандр Лукашэнка — ён пляскае ў далоні і пасміхаецца на вокліч паэта «Жыве Беларусь!» са сцэны Купалаўскага тэатра.

Шмат у фільме асабістых фотаздымкаў Барадуліна. Чорна-белыя — дзе ён яшчэ малы, пасля з жонкаю Валянцінай у 1960-я гады, з дачкой Ілонай; каляровыя — напрыклад, з унучкай Дамінікай. Багата кадраў, у тым ліку датаваных ваенным часам, з радзімы паэта — вёскі Ушачы.

Самым жа цёплым эпізодам Рыгор Барадулін назваў тыя кадры, дзе гучыць голас яго маці, Акуліны Андрэеўны, якая пайшла з жыцця ў 1971 годзе. У фільме гучыць песня ў яе выкананні.

«Ён сагрэў мне душу», — кажа пра фільм паэт.

З НАГОДЫ

# НОЧ МУЗЕЯЎ. СОН СВЯДОМАСЦІ

Аляксей ХАДЫКА

**«Ноч музеяў» — прыдуманая супрацоўнікамі парыжскага Луўра ў 1991 годзе акцыя па прыцягненню ў музейныя залы гледачоў у нестандартны час — прыйшла ў беларускія музейныя ўстановы ў шосты раз. Са 149 беларускіх установ — захавальнікаў гісторыі ініцыятарамі паўтарыць французскі досвед у Беларусі выступілі натуральныя лідэры, супрацоўнікі Нацыянальнага мастацкага музея. «НЧ» неаднаразова пісаў пра станоўчыя бакі ініцыятывы. З доляй сяброўскай іроніі — пра народжаны ёй недарэчнасці.**

Паколькі вясёлы карнавал прыйшоў з Парыжу — у Нацыянальным мастацкім музеі абвясцілі «Вечар у французскім стылі». У якасці эмблемы імпрэзы дэманстравалася поўнае юначай шчырасці палатно кіраўніка ўстановы, на якім маэстра гойдаўся на месяцы з французскай прыгажуняй. Прывабіць да высокага мастацтва гэтым разам імкнуліся сродкамі простанароднага мастацтва, самага даступнага для кожнага — кінематографа, дзякуй Богу, таксама вынайдзенага французамі, братамі Люм'ер: раз-пораз на экране дэманстраваліся стужачкі з эпохі народзін сінема.





Уяўленне пра французскі стыль жыцця дапаўнялася наяўнасцю ў залах музея вялікай колькасцю паўаголеных дам і мадэлек. Камусьці гэта нагадвала атмасферу свецкага будуара, камусьці — лазні. Мадэлькі дэманстравалі ўзоры свайго ўяўлення пра высокую моду. Прыцягваючы ўвагу гасцей з вуліцы, гэтая дэманстрацыя, папраўдзе, ніяк не спрыяла знаёмству выпадковых гасцей з творамі мастацтва, бо прыгадаць назаўтра тое, што абкружала іх у сценах музея, апрача вадэвільных сюжэцікаў паратэатральных шоу, яны наўрад ці былі здольныя. Убачыць у экспазіцыі музея выставачныя спасылкі на беларускую культурную прысутнасць у Парыжы пасля паўстанняў XIX стагоддзя альбо ў часы эміграцыі XX стагоддзя, як нехта спадзяваўся, не ўдалося.

Затое французскі акцэнт — баль у стылі Ваньковіча — паставіў у гэты вечар творчы калектыў «Гісторыка» ў сценах Нацыянальнага гістарычнага музея. Як своеасаблівы рэквіем па вялікаму беларускаму мастаку, які спачыў у выгнанні ў Парыжы. І, трэба сказаць, на гэтай частцы вячэры хапала і весялосці, і густу, і праўды гістарычных рэмінісцэнцый, якія спрыяюць выхаванню паўнавартаснага грамадзяніна сучаснай Беларусі. А вось «разынкай» вечара ў Гістарычным музеі абвясцілі дэманстрацыю параднага шыняля расійскага імператара Аляксандра І.

Чаму атрыбуту імператарскага побыту пачатку пазамінулага стагоддзя была нададзеная выключная ўвага, следам за гаспадарамі музея не зразумелі і яго наведнікі. Першыя рабілі выгляд, што сярод 400-тысячнай калекцыі паважанай установы няма больш вартаснага экспаната, другія — ветліва дэманстравалі, што суконны цуд ім цікавы. Аляксандраўскія лахманы — сімвал эпохі бязладдзя ў Беларусі, падчас якой Полацкі універсітэт спачатку ператварыўся ў кадэцкі корпус для акупацыйнага войску, а потым ягоныя інтэлектуальныя скарбы былі нахабна скрадзены і звезены за мяжу, у расійскія сховы. Адначасова была знявечаная ўся краіна.

На жаль, неадэкватны выбар цвіковых аб'ектаў музейнага свята — лагічны працяг экспазіцыйнай палітыкі аднаго з найважнейшых музеяў краіны, у выніку якой ён рызыкуе ператварыцца ў беларускі варыянт філіялу дысней-лэнду. Днямі ў залах музея адчынілася выстава, у якой не прадстаўлена ніводнага (!) арыгінальнага экспаната — «Орудия наказания Средневековья» — запазычаная ў Дзяржаўнага музея гісторыі Санкт-Пецярбурга «Петрапаўлаўская крэпасць». Адкажыце, у такім выпадку, чым адрозніваецца нацыянальны музей ад прывакзальнай залі гульнявых аўтаматаў?

Знакам узроўню эфектыўнасці падобнай беззмястоўнай, пазбаўленай адчування сутнасці ўласнай гісторыі арганізацыі музейнага жыцця можа служыць вынік «музейнай ночы» ў Бабруйскім краязнаўчым музеі. Мясцовыя энтузіясты, апранутыя ў вопратку расійскіх салдат і мяшчан XIX стагоддзя, раздавалі ў той вечар наведвальнікам… сухары. Імпрэза прыцягнула ўвагу 50 чалавек.




Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 461
Падпісана да друку 21.05.2010. 8.00.
Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.